Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 КРАСАВІКА 2015 г. ЧАЦВЕР № 72 (27930) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Сібірачка паехала за мужам у Мінск



## Фірмовая страва Аляксея Дударава

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Дзяржпагранкамітэта:**

*«Вельмі важна навучыць нашых маладых людзей адшукваць ісціну ў бясконцай лавіне інфармацыі. Кожны малады чалавек павінен глыбока разумець сітуацыю, якая складваецца ў свеце і краіне. У сучасных умовах, калі супраць суверэнных дзяржаў пачынаюць выкарыстоўвацца рознага кшталту паліттэхналогіі з упорам на раздуванне пратэснага руху, агрэсіўнага нацыяналізму, мы павінны быць не проста спажыўцамі інфармацыі, але ўмець яе прааналізаваць, зразумець сутнасць, зрабіць правільныя высновы. І самае галоўнае — адстойваць сваю пазіцыю».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.03.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14330,00 | ▼ |
| Еўра | 15200,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 664,58 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Добра, калі побач сябар



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Спецыяльны рэпартаж

## На парад — хоць заўтра!

Якія «разынкі» чакаюць мінчан і гасцей сталіцы падчас шэсця Перамогі?

**Гудуць матory, у паветры клубіцца дым, пад нагамі дрыжыць растрывожаная цяжкай тэхнікай зямля. Палігон трэба перабегчы хутка, бо крыху прамарудзіш — і трапіш пад калону танкаў, якая ідзе наўпрост на цябе. Гэта не ваенныя дзеянні і не здымкі блакбастара — карэспандэнты «Звязды» пабывалі на трэніроўцы механізаванай калоны, якая пройдзе па Мінску ў Дзень Перамогі.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Парад войск мінскага гарнізона адбываецца ў сталіцы штогод, але сёлетняй асаблівасцю стане тое, што пройдзе ён не як звычайна — 3 ліпеня, а ў дзень капітуляцыі Германіі — 9 Мая. Пра гэта расказаў **намеснік камандуючага войскамі паўночна-заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Андрэй НЕКРАШЭВІЧ.**

— Апроч гэтага, у парадзе ўпершыню возьме ўдзел значная колькасць расійскай тэхнікі са складу рэгіянальнай групоўкі войск Беларусі і Расійскай Федэрацыі, — дадаў ён.

Агулам у парадзе войск мінскага гарнізона будуць удзельнічаць больш за 250 адзінак баявой тэхнікі, якія ўключаюць у сябе 24 парадныя разлікі (сем з іх — з Расіі). Упершыню на парадзе будуць прадстаўлены ўзоры тэхнікі, зробленай на беларускіх прадпрыемствах. Даўжыня калоны парада складзе каля двух кіламетраў.

СТАР. 4

■ «Славянскі базар у Віцебску»

## А ДЗЕЦІ ТРАПЯЦЬ У... КОСМАС!

**Сёлета, як ніколі раней, шмат ахвотных узяць удзел у конкурсах «Славянскага базару». Нават за акіянам убачаць фестывальныя канцэрты дзякуючы спадарожнікаваму тэлеканалу «Беларусь 24».**

XXIV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» афіцыйна пройдзе з 9 па 13 ліпеня. Ужо традыцыйнымі сталі дадатковыя дні правядзення фэсту (7-8 і 14-15 ліпеня).

Як заўсёды, вялікі акцэнт робіцца на конкурсны праграме.

— З задавальненнем адзначаю, што, як ніколі, шмат заявак на ўдзел у конкурсах. І ўзровень кандыдатаў высокі. Ужо праведзены 12 нацыянальных адборачных тураў. У творчых выпрабаваннях на дарослы конкурс бралі ўдзел 227 чалавек, а на дзіцячы — больш за 200. Па сваёй ініцыятыве заяўкі прыслалі прадзюсары і выканаўцы з 13 краін. Папярэднія перамовы праводзілі з канкурсантамі з Германіі, Кітая, Славакіі, ЗША, Фінляндыі і нават Японіі, — расказаў **Аляксандр СІДАРЭНКА, дырэктар Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

СТАР. 4

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

■ Парламенцкі дзённік

# «Пытанні трэба вырашаць на месцах»

**Мясцовыя Саветы дэпутатаў блізкія да праблем і патрэб насельніцтва. Такое меркаванне выказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з дэпутатамі Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў і членамі Маладзёжнай палаты.**

«Праз дэпутатаў розных узроўняў можна ўлічыць усе пытанні, якія падымае грамадзянская супольнасць, а таксама палітычныя партыі, розныя грамадскія аб'яднанні. Можна аказаць уплыў на ўладу пры прыняцці ўсіх іншых рашэнняў, — адзначыў спікер. — Мясцовыя Саветы дэпутатаў знаходзяцца найбліжэй да праблем, клопатаў і патрэб насельніцтва».

Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, дэпутаты павінны быць рэальным сувязным звяном паміж уладай і народам. Роля дэпутатаў мясцовых Саветаў пастаянна ўзрастае, у тым ліку дзякуючы прыняццю асноўных дакументаў. «Мясцовае самакіраванне іграе вялікую ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны і павышэнні дабрабыту насельніцтва. Мы, у сваю чаргу, робім неабходныя меры на заканадаўчым узроўні», — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. У прыватнасці, ён нагадаў, што нядаўна былі ўнесены змяненні ў некаторыя законы па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання, дзе прадугледжаны важныя папраўкі, якія таксама накіраваны на аказанне садзейнічання мясцовым органам улады ў вырашэнні эканамічных праблем.

Пры гэтым спікер звярнуў увагу, што не заўсёды ў рэгіёнах надаецца дастатковая ўвага працы з праблемамі насельніцтва, у выніку чаго гэтыя праблемы выносяцца на больш высокі ўзровень. «Пытанні трэба вырашаць на месцах. Усё залежыць ад ініцыятыўнасці, адказнасці дэпутатаў», — лічыць Уладзімір Андрэйчанка.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ** ■

■ На старт!

# ВЫБІРАЦЬ — ДЫК «КАРАЛЕВУ»

**Міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў, міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко, старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі і дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Валянціна Баляба падпісалі Мемарандум па прасоўванні лёгкай атлетыкі ва ўстановах адукацыі Беларусі.**

У маі будзе дадзены старт рэспубліканскай спартыўна-масавай акцыі «300 талентаў для Каралевы», якая ахопіць дзяцей малодшага школьнага ўзросту па ўсёй краіне. Першы этап тэсціравання вучняў 1-4 класаў пройдзе падчас звычайных урокаў фізкультуры. У верасні яшчэ раз будуць пераправераны атрыманыя вясной вынікі, пасля чаго для заняткаў лёгкай атлетыкай адберуць 300 найбольш адораных дзяцей.

— У ходзе праекта плануем выдаткаваць 1 млрд рублёў. Гэтыя сродкі выдзелены нашым партнёрам — кампаніяй «Белдзяржстрах». Фінансы будуць накіраваны на падтрымку настаўнікаў фізкультуры, вылучэнне грантаў, набыццё экіпіроўкі і прызоў для юных спартсменаў. Федэрацыя лёгкай атлетыкі пастараецца прыцягнуць як мага больш моладзі і прадэманстраваць, што займацца спортам модна, — адзначыў **Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Немалаважная роля ў паспяховым выкананні праграмы адводзіцца Міністэрству адукацыі, якое валодае развітай спартыўнай інфраструктурай.

— Лічу, што вельмі важна прыцягнуць дзяцей малодшага школьнага ўзросту да заняткаў спортам праз сістэму спаборніцтваў. Інфраструктура Мінадукацыі дазваляе выканаць усю праграму, якая разлічана не на адзін год, — расказаў **Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

На думку **міністра спорту і турызму Аляксандра ШАМКО**, праект — гэта яшчэ адзін сучасны спосаб падрыхтоўкі рэзерву.

— Лёгкая атлетыка з'яўляецца базавай для многіх іншых відаў спорту, і акцыя «300 талентаў для Каралевы» — магчымасць не толькі адабраць будучых «зорак», а магутны сацыяльны праект, які дазваляе прыцягнуць як мага больш дзяцей да заняткаў фізічнай культурай, — упэўнены Аляксандр Шамко. — У Беларусі выбудавана выразная сістэма падрыхтоўкі прафесійных атлетаў. Дзейнічае 397 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, але, як нядаўна адзначыў кіраўнік дзяржавы, неабходна не колькасна, а якасна падыходзіць да падрыхтоўкі спартсменаў. Бо толькі 50% выпускнікоў вучылішчаў алімпійскага рэзерву траплялюць потым у нацыянальныя зборныя. Відавочна, што ў сучасных умовах патрабуюцца новыя падыходы ў вызначэнні патэнцыялу будучых прафесійных атлетаў і праект, які стартуе ў лёгкай атлетыцы, дазволіць нам гэта зрабіць.

Мемарандум прадугледжвае папулярызацыю лёгкай атлетыкі ва ўстановах адукацыі, абмен досведам і інфармацыяй у галіне масавага спорту дзяцей і моладзі. Па прапанове Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў на працягу 2015 года адбудуцца спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы сярод дзяцей і падлеткаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

# Загінулі пад Глыбокім...

**На Глыбоччыне днямі ўшанавалі памяць італьянцаў, якіх фашысты забілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Напэўна, нямногія ведаюць, што сярод вязняў у лагерах смерці, створаных у Беларусі, былі і грамадзяне Італіі.**

Каля дваццаці астанкаў тых, каго ўтрымлівалі ў канцлагеры ў вёсцы Арэхаўна, беларускія ваенныя пошукаўцы знайшлі ў лесе напрыканцы 1990-х гадоў. Паводле слоў краязнаўцаў, у тым лагеры смерці было каля 600 грамадзян Італіі. У населеным пункце ўстанавілі помнік. На ім надпіс: «Тут пахаваны астанкі мірных жыхароў і італьянскіх ваеннапалонных, па-зверску закатаваных фашыстамі ў гады сусветнай вайны ў 1941-1944 гг. Вечная памяць».

І ў раёне Беразвечча размяшчаўся лагер смерці (шталаг № 351), дзе знішчылі больш за 27 тысяч чалавек. Разам з савецкімі грамадзянамі забілі і італьянскіх ваеннапалонных. У 1964 годзе на месцы масавага пахавання вязняў адкрылі мемарыяльны комплекс...

— 2 ліпеня 1941 года Глыбокае акупавалі нямецка-фашысцкія захопнікі. Горад быў ператвораны ў цэнтр акругі рэйхскамісарыята «Остланд». Тут размяшчаліся ўправа акругі, нямецкі гарнізон, вайсковыя склады. Акупанты стварылі і яўрэйскае гета, якое знішчылі ў 1943 годзе... 3 ліпеня 1944 года савецкія войскі вызвалілі Глыбокае, — паведамілі «Звяздзе» ў райвыканкаме.

Аддаць даніну памяці землякам у Глыбоцкі раён прыехалі прадстаўнікі пасольства, СМІ, італьянскай асацыяцыі былых ваеннапалонных, інтэрніраваных асоб, ветэранаў вызваленчай вайны...

**Уга БОНІ, намеснік кіраўніка дыпламатычнай місіі Італіі ў Беларусі, камерцыйны саветнік пасольства Італіі**, выказаў шчырую падзяку прадстаўнікам мясцовай улады і Беларусі ўвогуле. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ў нас не дзеляць ахвяр фашызму па нацыянальнай прыкмеце.

— Захаванне памяці вельмі важна для гісторыі. У першую чаргу, каб не дапусціць падобнага. Павага памяці — найлепшы паказчык дружбы паміж народамі, — сказаў ён.

Падчас візіту, які адбыўся ў рамках святкавання юбілею Перамогі, абмяркоўваліся перспектывы супрацоўніцтва. Італьянскія госці агучылі ідэю маладзёжнага абмену. У прыватнасці хлопцаў і дзяўчат з Глыбоччыны, магчыма, запросяць у сталіцу Італіі і наадварот. Ёсць намер арганізаваць у Глыбокім паказ італьянскага кіно, як гэта было зроблена ў Мінску. Дарэчы, у сталіцы Беларусі запланаваны круглы стол, прысвечаны тэме інтэрніраваных італьянскіх вайскоўцаў у гады вайны...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота БЕЛТА.

**Кветкі ўскладаюць старшыня Глыбоцкага райвыканкама Алег МОРХАТ і саветнік пасольства Італіі Уга БОНІ.**


МТБанк
Банк свежих решений

Наименование банка:

**ЗАО «МТБанк», г. Минск**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2015 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 274 512 | 303 929 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 237 630 | 286 880 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 605 570 | 404 353 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 210 298 | 159 621 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 3 152 521 | 3 013 203 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | 81 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 244 | 244 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 189 558 | 130 649 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 20 515 | 278 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 103 625 | 55 756 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 4 794 473 | 4 354 994 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 636 542 | 674 911 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 3 163 771 | 2 715 030 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 249 542 | 434 002 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 60 906 | 46 416 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 4 110 761 | 3 870 359 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 121 857 | 121 857 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 64 530 | 53 494 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 31 784 | 25 680 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 465 541 | 283 604 |
| 30 | Всего собственный капитал | 121 | | 683 712 | 484 635 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 4 794 473 | 4 354 994 |

**Ссылка на отчетность на сайте: http://www.mtbank.by/about/reporting/balansbanka**

Руководитель А.К.Жишкевич

Главный бухгалтер В.В.Ермолович

Дата подписания 7 апреля 2015 года

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 1 квартал 2015 года**

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 256 674 | 254 987 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 187 063 | 182 536 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 69 611 | 72 451 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 122 175 | 100 459 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 13 961 | 12 736 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 108 214 | 87 723 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 1 555 | 5 292 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 28 788 | 13 660 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 2 141 | 420 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 83 912 | 62 045 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 27 538 | 8 567 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 123 015 | 79 013 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 6 369 | 5 136 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 24 551 | 41 919 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 951 | 5 087 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 21 600 | 36 832 |

**Ссылка на отчетность на сайте: http://www.mtbank.by/about/reporting/pribilrep**

Руководитель А.К.Жишкевич

Главный бухгалтер В.В.Ермолович

Дата подписания 7 апреля 2015 года

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13, выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года.
УНП 100394906



Страховой полис по добровольному страхованию серии ПЕ № 0138213 **считать недействительным в связи с утерей.**

■ Тры пытанні да ўлады

# НОВЫ ТВАР РОДНАГА ГОРАДА

**У Магілёве палепшыцца стан дарог, адновіцца мост і з'явіцца больш утульных двароў**

**Пра тое, што сёлета чакае абласны цэнтр у рамках яго добраўпарадкавання, паведаміў старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦУМАРАЎ.**

***— Нарэшце нашаму гораду не прыйдзецца больш «чырванець, што ў яго няма добрага парку культуры і адпачынку. Летась у Падніколлі шмат чаго зроблена, каб гэтае прыгожае, але пакуль што яшчэ «дзікае» месца на беразе Дняпра зайграла ўсімі фарбамі. Якія планы па гэтым аб'екце на бліжэйшы час?***

— Неўзабаве пачнуцца работы па ачыстцы рэчышча Дняпра, працягнецца выразка дзікарослага хмызняку, будуць высаджвацца дрэвы і кветкі. Плануецца правесці комплекснае добраўпарадкаванне берага ракі на працягу звыш 16 кіламетраў у абодва бакі. На рэалізацыю праекта неабходна больш за 80 мільярдаў рублёў. Такіх грошай у гарвыканкама няма, таму прынята рашэнне рабіць справу паэтапна і прыцягваць да работ гараджан. Тэрыторыя агульнай плошчай каля 480 га разбіта на сектары і замацаваная за 43 прадпрыемствамі і арганізацыямі. Яны будуць падтрымліваць тут чысціню. Сваю лепту ўносяць жыхары горада, у тым ліку моладзь. На суботніку, які прайшоў 4 красавіка, на добраўпарадкаванні тэрыторыі будучага парку працавалі некалькі сот чалавек.

***— Самы стары ў горадзе мост па Пушкінскім праспекце, які ўжо паспеў нагадаць, што яму «цяжка», чакае вялікая рэканструкцыя. Улічваючы, што праз яго пралягаюць асноўныя транспартныя маршруты, як доўга можа працягнуцца рамонт і ў якую суму абыдзецца?***

— Мост не плануецца цалкам закрываць; можа, толькі на нейкі час і на пэўным этапе. Архітэктурны і будаўнічы праекты гэтага аб'екта ўжо гатовыя, ёсць заключэнне дзяржаўнай экспертызы, вызначаны агульны кошт работ — каля 300 мільярдаў рублёў. Сёлета запланавана правесці падрыхтоўчыя работы з засваеннем сродкаў у аб'ёме 70 мільярдаў рублёў. Гэта сродкі так званага «транспартнага падатку» і крэдыту Банка развіцця. Пасля рэканструкцыі мост атрымае 2 дадатковыя паласы руху, што павялічыць яго прапускную здольнасць на 30%. Праектам прадугледжана таксама пашырэнне Дняпроўскага спуску ад плошчы Арджанікідзэ да вуліцы Чалюскінцаў і Пушкінскага праспекта да перасячэння з вуліцай Гагарына.

***— Рамонт дваровых тэрыторый таксама з разраду балючых пытанняў, якія турбуюць насельніцтва...***

— У комплексную праграму добраўпарадкавання горада сёлета ўключаны 34 дваровыя тэрыторыі. Падчас іх капрамонту будзе абноўлена асфальтавае пакрыццё, пастаўлены лаўкі, арэлі, новыя ліхтары, створаны газоны і кветнікі. Дарэчы, прадпрыемствам рэкамендавана самім набываць абсталяванне для двароў тых дамоў, дзе жывуць іх работнікі. Усе жыхары змогуць азнаёміцца з планам работ на іх тэрыторыі і асабіста прасачыць за ходам выканання. А калі яны яшчэ і далучацца да агульнай справы, будзе і наогул цудоўна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ А вы гатовы?

# Аналагаваму эфірнаму тэлебачанню застаўся месяц

А ў кожнай вобласці запрацуе рэгіянальны тэлеканал «Беларусь 4»

**Ужо больш за паўтара года ў краіне паступова адключаюцца старыя аналагавыя тэлевізійныя перадатчыкі. Дзень «Х», калі апошнія з магікан сыдуць у гісторыю тэхнікі, прыйдзе зусім хутка — 15 мая. І калі вы не паспелі дагэтуль набыць лічбавы тэлевізар ці спецыяльную прыстаўку, якая перакадзіруе сігнал для старэнькага аналагавага апарата, паспяшайцеся зрабіць гэта як мага хутчэй.**

Зараз жа ў краіне створана развітая сетка наземнага тэлевізійнага вяшчання стандарту DVB-T і DVB-T2. Прыём агульнадаступнага першага мультыплексу, які складаецца з васьмі тэлепраграм і аднаго радыёканала, магчымы зараз на 98 працэнтах тэрыторыі краіны. Ахоп насельніцтва другім і трэцім мультыплексамі, у якіх вядзецца камерцыйнае вяшчанне, крыху меншы — 92 і 89 працэнтаў. Аднак і гэтыя лічбы стануць большымі.

— Яшчэ ў 2006 годзе ў Жэневе было падпісана пагадненне аб тым, што да 17 чэрвеня 2015 года эпоха аналагавага вяшчання ў дэцыметровым дыяпазоне павінна ў свеце скончыцца, — расказвае **начальнік сектара тэлебачання, радыёсувязі і радыёвяшчання Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Віктар ЗАЙЦАЎ.** — Апошнія беларускія радыётэлевізійныя перадаючыя станцыі, якія зусім хутка канчаткова пяройдуць на лічбу, размешчаны ў Століне, Браславе, Мазыры, Салігорску, Старых Дарогах, Крупках, Бычысе, Стрэльчыках, Тракеніках і Калодзішчах.

**Пытанні па пераходзе на лічбавы фармат тэлевяшчання можна задаць па тэлефоне даведачнай службы — 172.**

Пераход на лічбавае тэлебачанне нясе з сабой не толькі паляпшэнне якасці сігналу ў параўнанні са старым фарматам, але і значную эканомію электраэнергіі. Па звестках **галоўнага інжынера прадпрыемства «Беларускі радыётэлевізійны перадаючы цэнтр» Андрэя КАРАІМА,** у 2005 годзе аналагавыя перадатчыкі спажылі 21 з паловай мільён кілават-гадзін. А вось на працу агульнарэспубліканскай сеткі лічбавых рэтранслятараў, па разліках, спатрэбіцца толькі 6,5 мільёна кілават-гадзін.

Акрамя гэтага, у беларускай тэлевізійнай прасторы зусім хутка запрацуе новы незвычайны тэлеканал.

— Мы падтрымалі ініцыятыву Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь па стварэнні ў краіне рэгіянальнага тэлеканала «Беларусь 4», — паведаміў **начальнік упраўлення электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Уладзімір ЯДРАНЦАЎ.** — Але гэта будзе не проста адна кнопка. Пад агульнай назвай будуць аб'ядны ўсе рэгіянальныя тэлеканалы, якія запрацуюць у кожнай вобласці. У Гомелі, Віцебску, Брэсце, Магілёве створаны выдатныя вытворчыя базы. Аднак яны, на жаль, вяшчаюць вельмі мала — невялікімі адрэзкамі часу раніцай і ўвечары. Цяпер яны займеюць магчымасць выходзіць у эфір на працягу ўсяго дня. І карысць ад гэтага будзе вельмі вялікая для ўсіх — як для невялікіх рэгіянальных тэлекампаній, так і для гледачоў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Дайце рады!

# РАСПУСЦІЎ РУКІ — ПАКІНЬ СВАЮ ХАТУ!

## Як справіцца з гультаямі і хатнімі тыранамі



**Сярод новых мер перавыхавання сямейных дэбашыраў ёсць і такая: нейкі час ім забараняюць прыходзіць дадому. Нават тэлефанаваць. Міжвольна ўспамінаюцца амерыканскія фільмы, у якіх героям па рашэнні суда забараняецца набліжацца да жонкі, дзяцей на канкрэтную адлегласць. Аналагічнае, але з «беларускім акцэнтам» ёсць цяпер і ў нас. Але ж такім чынам караюцца толькі тыя, хто скандаліць, стварае дыскамфорт для блізкіх людзей. Апошнім, дарэчы, можна схавацца ў спецыяльных «крызісных пакоях».**

### А НА ПРАЦЫ — АНЁЛ...

Яшчэ і гадзіны дня няма, а ён у такім стане, хоць у мядзвецвярэзнік адпраўляй. Нямыты, няголены, пахне ад яго, мякка кажучы, вельмі не прыемна. На выгляд гадоў пад 60, а нарадзіўся ж у 1975-м.

— Хварэю я. Грып у мяне! Лячуся, — тлумачыць свой стан таварыш, які ледзь стаіць на нагах.

— Злоўжываеце спіртным. А ў такі час, як зараз на гадзінніку, нармальныя людзі працуюць, а вы... Жывяце на мамчыну пенсію, а ёй, замест дзякуй, скандалы, — перавыхоўвае гультая на маіх вачах **капітан міліцыі, старшы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі РАУС Кастрычніцкага раёна г. Віцебска Вольга ШУМСКАЯ.** Гэтай абаяльнай жанчыне даводзіцца працаваць з такімі асацыяльнымі элементамі. Выхоўвае, не непаслухмяных малых, каб узяліся за розум.

— Як вы давялі да такога стану сябе? Зразумела, алкагалізм да дабра не давядзіць! Хворы вы? Дык вас лячыць трэба — толькі не ў паліклініцы, а ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, — звяртаецца да гэтага ж гультая і адначасова хатняга скандаліста **намеснік начальніка аддзела па наглядзе за дазнаннем пракуратуры Віцебскай вобласці Юрый АМБРОС.**

Яшчэ аднаго «джэнтльмена ўдачы» чатыры разы прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за скандалы ў нецвярозым выглядзе. На 5 сутак быў выселены з дома. Калі вярнуўся, зноў пачаў канфліктаваць.

— На шлях выпраўлення не стаў. І яго паўторна папярэдзілі, што зноў будзе вынесена ахоўнае прадпісанне. У выніку не зможа не толькі дамоў прыходзіць, але і тэлефанаваць тым, каго крыўдзіў... Дзве камісіі для накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый адбыліся, — тлумачыць Вольга Шумская.

**У кожным раёне Віцебшчыны адкрылі так званыя «крызісныя пакоі». Яны ўяўляюць з сябе пакоі ў інтэрнатах або кватэры з дзяржаўнага жыллёвага фонду. Дзе менавіта яны знаходзяцца — сакрэтная інфармацыя.**

Яшчэ адзін гультай, які не працуе, усё скардзіўся на цешчу.

— Я жонку сваю кахаю, паверце! І дзяцей люблю! Толькі вось цешча літаральна жыцця не дае! Як вам растлумачыць? Каб не яна, усё ў нас было б добра! — ледзь не плакаў ён.

Слухаў я яго і стараўся зразумець. Так, ёсць цешчы — не падарунак, мякка кажучы. Але ж ты — мужык або хто? Біць жанчыну — подла. А калі так ужо не маці не падабаецца, дык зарабляй добрыя грошы, каб зняць кватэру... Не? Прасцей апраўданні шукаць.

### ЗДЗІВІЛІ І «КАНДЫДАТЫ»

Малады мужчына параўнальна прэзентабельнага выгляду, але пастаянна дома скандаліць. Яго папярэдзілі, што калі паведамяць пра гэта па месцы працы, той можа страціць добрую пасаду. Ён — матарыст у рачным порце. Там стабільна выплачваюць даволі нeблагія грошы... Насамрэч, атрымліваецца, што на працы ён — «анёл», а дома — тыран?

Яшчэ адзін адсядзеў за кратамі за тое, што нажом парэзаў жонку брата. Працуе, але дома паводзіць сябе па-ранейшаму: скандаліць, хаміць... Яго папярэдзілі, што калі забарона з'яўляцца дома падасца «казкай», могуць пакараць і больш жорстка.

Скандалістаў працаздольнага ўзросту можна адправіць у вышэйзгаданы прафілакторый. А што рабіць з «агрэсіўнымі» пенсіянерамі? Па законе, яны не гультаі. Жывуць па прынцыпе: заслужыў пенсію і буду жыць, як хачу...

— Учора быў у мяне дзень нараджэння. Выпіў няшмат. Раніцай участковы забраў. За што? Я законы не парушаю. Так, прадпісанне выносілася. Я дома нікога не крыўдзіў. У трохпакаёвай кватэры з былой жонкай жыву. Так, у разводзе, дзеці дарослыя... Трохі выпіваю. Драпіна ў мяне на галаве адкуль? На Кубе быў восем разоў. Да пенсіі працаваў штурманам на судне, — адказвае на мае пытанні скандаліст пенсійнага ўзросту. А драпіна ж у яго «свежая». Адкуль, не памятае. Ад яго непрыемна пахне «перагарам».

Такі ж скандаліст-пенсіянер з дачкой канфліктуе. Тройчы на працягу чатырох месяцаў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за прычыненне ёй псіхічных і фізічных пакут. Пастаўлены на ўлік. Атрымаў афіцыйнае папярэджанне. Ведае, што можа на час быць пазбаўлены права жыць у сваёй жа кватэры...

### ДАПАМОЖА «КРЫЗІСНЫ» ПАКОЙ

— Напрыканцы мінулага года быў прыняты закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». Ён дае новыя магчымасці для рашэння праблем гвалту ў сям'і. Размова ідзе пра ахоўнае прадпісанне. Згодна з ім, пасля афіцыйнага папярэджання вінаваты на працягу ад 3 да 30 сутак пазбаўляецца права пражываць там, дзе скандаліў. Забараняецца нават тэлефанаваць тым, каго крыўдзіў. Летась такім чынам было вынесена 60 папярэджанняў, за тры месяцы бягучага года — ужо 40. Калі сваякі два разы за год звернуцца ў міліцыю і раскажуць пра абразы, пагрозы і іншае, гэтага дастаткова. А яшчэ ў якасці пакарання выкарыстоўваюцца штраф, адміністрацыйны арышт, — тлумачыць карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ПРАНЬКО.**

Каб скандалісты, якім недзе правесці «час ізаляцыі», не апыніліся на вуліцы, плануецца іх накіроўваць ва ўстановы для бяздомных. Прапрацоўваецца і іншыя варыянты.

А што тычыцца пацярпелых ад пагроз і агрэсіі, у кожным раёне Віцебшчыны адкрылі так званыя «крызісныя» пакоі. Яны ўяўляюць з сябе пакоі ў інтэрнатах або кватэры з дзяржаўнага жыллёвага фонду. Дзе менавіта яны знаходзяцца — сакрэтная інфармацыя. Трапіць туды проста. Калі, напрыклад, вы ведаеце, што можа адбыцца чарговы скандал, тэлефануйце ў міліцыю, на агульнанацыянальную «гарачую лінію» (8-801-100-8-801). Па тэлефоне атрымаеце ўсю неабходную інфармацыю. Пражыванне і харчаванне ў «крызісных пакоях» — за свой кошт. Як правіла, там могуць знаходзіцца сваякі дэбашыраў да 10 дзён.

— У асобных выпадках тэрмін пражывання можа быць падоўжаны. Грамадзяне паралельна атрымліваюць юрыдычную дапамогу і псіхалагічнае кансультаванне. Сёлета па дапамогу звярнуўся толькі адзін чалавек. Пенсіянерка расказала, што ўнук адбірае грошы і збівае яе. Яна на дзень была адпраўлена ў такі пакой, — расказвае «Звяздзе» **загадчыца аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Віцебска Людміла СЦЁПКІНА.**

Днямі журналіста «Звязды» запрасілі на паказальнае пасяджэнне ў РАУС Кастрычніцкага раёна Віцебска. Падчас мерапрыемства сямейнага скандаліста выселілі з дома на 10 сутак. А 7 яго «сабратаў па сямейным гвалце» атрымалі папярэджанні. Асаблівую ўвагу людзі ў форме надалі гультаям. Тыя, хто не на пенсіі, павінны працаваць! Ды не проста, каб міліцыянеры ды пракуроры «адчапіліся», а старанна. І каб дома паводзілі сябе нармальна. Інакш... чытайце пачатак артыкула.

Пасяджэнне, куды запрасілі гультаёў і скандалістаў, адбылося ў рамках рэспубліканскай прафілактычнай акцыі «Дом без гвалту». Ёсць над чым задумацца. На Віцебшчыне з пачатку годаназіраецца павелічэнне колькасці забойстваў у сем'ях. Брат забівае брата, сын — бацьку... Павялічылася і колькасць прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў (у 4 разы (!) у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года). Менавіта для прафілактыкі гэтага жаху, а не для справаздачы, і праводзілася акцыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

# На парад — хоць заўтра!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета парад пачнецца не раніцай, а ў 8 гадзін вечара. Адкрыюць яго традыцыйна пешыя парадныя разлікі: спачатку пройдуць сувораўцы, потым пранясуць Сцяг Перамогі і штандары 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў. Далей — механізаваная калона, першай у якой будзе прадстаўлена рэтратэхніка. Узначаліць яе танк Т-38, за ім — Т-37, танкі Т-34 — 76, Т-34 — 85. Дарэчы, апошнія лічбы абазначаюць калібры ўстаноўленых на танках гармат (76 і 85 мм адпаведна). Пасля танкаў пройдзе самаходная артылерыйская ўстаноўка СУ-100, лінейка танкаў ІС-2, ІС-3, ІСУ-152, пасляваенны танк Т-44, Т-55, Т-76. Потым — рэтратэхніка на колавым ходзе: ГАЗ-67 з 45-міліметровай супрацьтанкавай гарматай, шэраг з трох машын (у цэнтры — «Кацюша» БМ-13, па баках — ГАЗ-АА і ЗІС-5 з 75-міліметровымі супрацьтанкавымі гарматамі ЗІС-3). Замыкаць калону рэтратэхнікі будуць тры аўтамабілі ЗІЛ-157.

Упершыню ў складзе рэтратэхнікі на парадзе будзе прадстаўлены зенітны пражэктар. Гэта стацыянарнае прыстасаванне накіроўвала прамень святла на самалёт ворага, каб можна было трапна стрэліць па ім. Светлавы слуп мог выхапіць у небе паветраны аб'ект на адлегласці да чатырох кіламетраў! Для ўдзелу ў парадзе пражэктары пагрузілі на аўтамабілі. Таксама ў рэтракалоне «дэбютуе» адрэстаўраваная зенітная пушка АЗП-37 1937 года выпуску. Гледачы ўбачаць новыя ўзоры баявой машыны БМ-13 («Кацюшы»), адноўлены легкавы аўтамабіль ГАЗ-67. Пасля чаго перад трыбунамі пройдуць узоры сучаснай ваеннай тэхнікі, а ў небе можна будзе ўбачыць авіяцыйную тэхніку Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны. Завершыць ваенны парад плац-канцэрт роты Ганаровай варты і выступленне зводнага ваеннага аркестра Узброеных Сіл Беларусі. Па традыцыі свята завершыцца некалькімі дзясяткамі залпаў феерверкаў.

Знаходзячыся на рэпетыцыйным палігоне, у кароткіх перапынках паміж праходамі тэхнікі нам удалося паразмаўляць з некалькімі ўдзельнікамі будучага парада. Сярод іх Уладзімір Юрэвіч, які служыць у 355 асобным танкавым батальёне. Сёлетні парад стане для яго чацвёртым. У якасці старшага машыны ён паедзе на танку Т-72Б — гэта асноўная баявая адзінка Узброеных Сіл Беларусі.



А вось для камандзіра зенітна-ракетнай батарэі лейтэнанта Рамана Міхайлава сёлетні парад стане першым, хаця ва Узброеных Сілах малады чалавек служыць ужо шэсць гадоў. У парадным разліку ён — камандзір баявой машыны, які каардынуе працу ўсяго экіпажа (механіка і аператара).

— Для мяне ўдзельнічаць у парадзе пакуль што нязвыкла. Трэніруемся тут ужо чатыры тыдні, з кожным разам атрымліваецца ўсё больш зладжана. Мы ўжо амаль дасягнулі дасканаласці! — падзяліўся Раман.

Калі я блукала паміж машынамі ваеннага часу і не ведала, да якой з іх падступіцца, на дапамогу прыйшоў падпалкоўнік Аляксандр Саўрыцкі, які прапанаваў... пракаціцца на сапраўдным гістарычным танку Т-34 — 85. На яго борце апроч нумара і пазыўнога «Чырвовы», некалькі сколаў ад снарадаў, атрыманых падчас баявых дзеянняў 70-гадовай даўніны. Менавіта такі танк прымаў удзел у вызваленні Беларусі ў складзе 5-й танкавай арміі, адным з першых уварваўся ў Мінск, прыняў бой на вуліцы Парніковавай, знішчыўшы нямецкага «Фердынанда» і кулямётнае гняздо ворага. Пасля гэтага камандзір танка лейтэнант Фролікаў выйшаў на радыёчастату камандзіра брыгады і паведаміў, што шлях на сталіцу вызвалены...

Нягледзячы на ўзрост і ўдзел у баях, танк, якім ужо другі раз будзе кіраваць на парадзе Аляксандр Саўрыцкі, цалкам спраўны. Падпалкоўнік прызнаўся, што вельмі ганарыцца даручанай яму задачай.

...Калі мы пакідалі трэніровачны палігон, па ім працягвалі з гулам ездзіць цяжкія баявыя машыны. А ў небе над імі ў гэты час кружлялі шэсць буслоў. Здавалася, яны зусім не баяліся такой страшнай у ліхую гадзіну тэхнікі. Як быццам бы ведалі, што на Беларусі яна грукоча толькі на вучэннях ды ўрачыстых парадах.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*Мінскі раён.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ■ Без межаў

## СУЦІН ВЯРТАЕЦЦА Ў СМІЛАВІЧЫ

**Легендарнаму мастаку XX стагоддзя Хаіму Суціну, які нарадзіўся ў Смілавічах Чэрвеньскага раёна, прысвечана I Міжнародная навуковая канферэнцыя «Суцінскія чытанні», якая пачне сваю працу ў найбліжэйшую нядзелю.**

Адбудзецца гэтая імпрэза якраз у Смілавічах. З дакладамі выступяць дасведчаныя ў гісторыі мастацтва спецыялісты. Будзе прэзентаваны фільм «Хаім Суцін» французскага кінарэжысёра М. Абітбола-Леві. А таксама адбудзецца знаёмства з раманам Р. Дутлі «Апошняе падарожжа Суціна». Мінскі кінадакументаліст Зоя Катовіч прадставіць удзельнікам канферэнцыі фільм «Шрага Царфін» — пра яшчэ аднаго нашага земляка, які пакінуў адметны след у мастацтве. Дырэктар «Кніжнага салона» Ала Зміёва прэзентуе пленэр «Прастора Суціна». А вынікі канферэнцыі падвядзе мастацтвазнаўца Таццяна Бембель.

**Сяргей ШЫЧКО**

# А ДЗЕЦІ ТРАПЯЦЬ У... КОСМАС!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выступяць толькі каля 20 канкурсантаў. Нашу краіну прадставяць: Валерыя Грыбусова, салістка Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі, а таксама 9-гадовая Стэфанія Сакалова з Мінска і 11-гадовая Алена Цітова з Магілёва.

Штогод у дырэкцыі стараюцца, каб дзятва літаральна трапіла ў казку: раней у госці да Нязнайкі, чараўніка Смарагдавага горада і іншых казачных персанажаў. Сёлета маленькія таленты і гледачы на фестывальным конкурсе «адправяцца ў космас»...




Фота БЕЛТА.

Рэжысёр ганаровага адкрыцця чарговага фэсту — «зорка» тэлебачання Ягор ХРУСТАЛЁЎ.

— Перада мной паставілі няпростую задачу: трэба зрабіць адкрыццё асаблівым, у параўнанні з папярэднімі гадамі. Кожны год узровень фестывалю павышаецца, глядач да гэтага прывыкае і чакае, што будзе яшчэ лепш. Пастараемся творча падысці да рэжысуры, — сказаў ён.

Паколькі сёлета святкуецца юбілей Перамогі, у Беларусі праводзіцца Год моладзі, вядома, гэтыя тэмы «прагучаць» і на «галоўным канцэрце» фэсту. Нюансамі рэжысёр з прадстаўнікамі СМІ не падзяліўся. Сказаў, што павінна быць інтрыга.

Можна будзе, вядома, сачыць за «Славянскім базарам» і па тэлебачанні. Традыцыйна пакажам пяць канцэртаў: два канцэрты фіналу маладых выканаўцаў, Саюзнай дзяржавы, адкрыцця і закрыцця фестывалю. Думаю, сумесна з калегамі з тэлеканала «Віцебск» запішам і пакажам дзіцячы конкурс і паўфінал дарослага... У гэтым годзе пашырым глядацкую аўдыторыю за кошт нашага спадарожнікавага брэнда «Беларусь 24», які вяшчае на ўвесь свет. Плюс у інтэрнэце пакажам фестываль і на ўсіх каналах тэлерадыёкампаніі, — расказаў **Кірыл КАЗАКОЎ, генеральны прадзюсар Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.**

У дырэкцыі канстатуюць, што ўсяго ўжо прадалі каля 7 тысяч квіткоў. Апошнія, нагадаю, можна забраніраваць і купіць па інтэрнэце.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## ОАО «БНБ-БАНК»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2015 | 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 129 480 | 102 480 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 728 388 | 470 928 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 70 078 | 67 232 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 919 187 | 1 077 601 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 799 | 78 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 133 023 | 114 433 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 22 150 | 8 374 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 295 | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 28 723 | 16 026 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 032 123 | 1 857 152 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 103 716 | 102 538 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 626 107 | 451 298 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 1 639 474 | 831 811 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 5 144 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 231 580 | 134 779 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 17 952 | 14 789 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 618 829 | 1 540 359 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 110 752 | 69 220 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 63 682 | 44 277 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 87 736 | 97 740 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 151 124 | 105 556 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 413 294 | 316 793 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 032 123 | 1 857 152 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2015 | 01.04.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 93 888 | 50 083 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 47 458 | 21 298 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 46 430 | 28 785 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 20 211 | 14 589 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 3 908 | 2 760 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 16 303 | 11 829 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 82 642 | 9 886 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (63 834) | (7 203) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 32 426 | (1 193) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 795 | 10 168 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 25 578 | 27 137 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 723 | 902 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 22 609 | 26 619 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5 922 | 4 865 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 16 687 | 21 754 |

Заместитель Генерального директора С.К.Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания "08" апреля 2015 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**(http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnostj/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html)**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 07 июня 2013 г.
УНП 100513485.

Дело №60-№Б\2013 определение об открытии конкурсного производства от 31.07.2013 г., Экономический суд Гомельской области, судья Новикова .И., ООО «Ельскдревпром» (УНП 490333827, г. Мозырь, ул. Иваненко, 15, пом. №4), управляющий в деле о банкротстве ООО «Ельскдревпром» частное предприятие «Модель управления» директор Журов В.А. извещает о результатах торгов (аукциона) по продаже имущества ООО «Ельскдревпром», проведенного 31.03.2015 г. Лот № 2-19 – аукцион признан несостоявшимся ввиду отсутствия претендентов (участников), Лот №1 – единственный претендент отказался от приобретения имущества. Лот № 6 – претендентом на покупку признан единственный участник, цена продажи 13806870 рублей. Лот №16 – продан, цена продажи 5155975 рублей, Лот №15 – продан, цена продажи 25561854 рубля. Лот №11 – продан, цена продажи 539721450 рублей. Лот №17 – продан, цена продажи 10871516 рублей. Лот №14 – продан, цена продажи 2768241 рубль. Лот №13 – претендентом на покупку признан единственный участник, цена продажи 20983620 рублей. Лот №7 – претендентом на покупку признан единственный участник, цена продажи 793400 рублей. Лот №8 – претендентом на покупку признан единственный участник, цена продажи 793400 рублей. Лот №10 – претендентом на покупку признан единственный участник, цена продажи 39026190 рублей.

Дело № 92-5Б\2014, определение об открытии конкурсного производства от 23.06.2014, Экономический суд Гомельской области, судья Стрекач Т.А., управляющий в деле о банкротстве Журов В.А. извещает, что свидетельство о государственной регистрации, печать (штампы) ООО «Тропическая зона» (УНП 490680969, г. Речица, ул. Набережная, 110\12) **являются недействительными.**

Сямейная газета
Выпуск № 6 (29)


Фота Івана КУПАРВАСА.

## ПРА ВЕЦЕР ПЕРАМЕН

— Вось тут напісана: «Au revoir». *Што гэта значыць?*

— *Па-мойму, гэта па-французску. Здаецца, «бывайце». Не, «да пабачэння». Дакладна, «да пабачэння»!*

— *Значыць, усё ў парадку!*

*(з к/ф «Мэры Попінс, да пабачэння»).*

...Шчыра кажучы, я не ведаю, як гэта — адпусціць ад сябе дзіця ў самастойнае жыццё. Дачка ўсё ж яшчэ занадта маленькая, а каменныя джунглі горада занадта імклівыя і небяспечныя, каб можна было ўявіць яе адзіночны праменад нават у тэорыі.

І потым, што значыць — адпусціць? Выпхнуць з «гнязда», каб прымусіць расправіць уласныя крылы? Даваць усё больш магчымасцяў для самастойнага выбару і, адпаведна, адказнасці за яго наступствы? Або ўсё адно нябачна знаходзіцца побач і — не кантраляваць, але быць гатовай пры неабходнасці прыйсці на дапамогу?

Памятаю, якім стрэсам для нас абедзвюх сталі першыя месяцы знаходжання ў дзіцячым садку. Ды што доўга гаварыць — бадай, кожная сучасная маці сутыкнулася на ўласным вопыце з перыядам адаптацыі: дзень добрага настрою, тыдзень істэрык, 10 дзён хваробы, і так па коле, пакуль абодва бакі не пераадолеюць пэўны псіхалагічны бар'ер: дзіця нарэшце адчуе сябе часткай соцыуму, а маці пяройдзе ад павышанай трывожнасці да спакойнай упэўненасці. Гэта атрымліваецца практычна ва ўсіх, але ад таго працэс не перастае быць хвалюючым і нават балючым.

Вось і з творчым «дзіцем» — «Сямейнай газетай», з якой больш чым за паўтара года мы фактычна зрасліся, нават не ўяўляла сабе, як развітацца. Бо і страшнавата, і шкада, і не без рэўнасці — а як жа, у якія б добрыя рукі ні перадаваў справу, а ўсё ж гэта рукі ўжо не твае. І ёсць спакуса зрабіць усё за ўсіх, паказаць, падказаць — «я ж лепей ведаю, як лепш»... Але на гэтым моманце я сябе спыняю і нагадваю вельмі простыя рэчы: усё цячэ і мяняецца, прыярытэты з часам перасоўваюцца, а «свежае вока», новыя людзі і ідэі практычна заўсёды ідуць на карысць любой справе. Таму выціскаю з сябе падсвядомага сабаку на сене і настройваюся, што будзе ў любым выпадку інакш, але ніколькі не горш.

Я вельмі ўдзячная ўсім тым чытачам, спецыялістам з розных сфер і героям публікацый, хто гэты час быў з «Сямейнай газетай» — можна сказаць, мы разам зрабілі першыя крокі і набылі пэўны, мяркую, небескарысны вопыт. Спадзяюся, што «СГ» не застанецца без вашай падтрымкі і ўвагі і надалей — многія рубрыкі з'явіліся дзякуючы вашым лістам і тэлефанаванням. Таму я дапісваю гэтую апошнюю — прынамсі, на бліжэйшыя месяцы ў якасці вядучай сямейнага выпуску калонку з цёплымі і светлымі пачуццямі, бо веру, што ўсё робіцца да лепшага, а за расстаннем абавязкова бывае сустрэча. І са спакойнай душой развітваюся, каб ушчыльную заняцца рэалізацыяй асабістых дэмаграфічных планаў.

Без шкадавання. З надзеяй. Да пабачэння!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Вам і не снілася...

# Яна сказала: «Я НЕ СУПРАЦЬ...»

Адным з маіх школьных таварышаў быў Коля Казлоў. Разам каталіся на каньках і лыжах, вудзілі рыбу, ганялі футбольны мяч. Сябравалі, адным словам. І вось аднойчы, калі Мікола быў у нас у гасцях, мой бацька спытаў, якога Казлова (у Чачэрску гэта прозвішча было даволі распаўсюджаным) ён сын?

— Ціта Міхайлавіча.

— О, адважнага партызана, — у бацькавым голасе адчувалася павага. А маці, здаецца, Ульянай клічуць?

— Ульянай Фамінічнай.

— Смелая жанчына. Вялікай душы чалавек.

Пазней я спытаў, адкуль бацька ведае Казловых, і пачуў, што ў райцэнтры часта пераказвалі незвычайны лёс гэтай сям'і, якая прайшла суровыя выпрабаванні ў гады ваеннага ліхалецця і ў мірны час. У маёй памяці засталіся толькі яго словы пра тое, што Ціт Міхайлавіч быў удзельнікам грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, што яго першую жонку расстралялі нацысты, а сыноў уратавала незнаёмая жанчына, якая рызыкавала сваім жыццём і жыццём уласных дзетак, што з ёй потым Ціт Міхайлавіч стварыў сям'ю і ў іх з'явіўся агульны сын, што жывуць яны згодна, дружна, у каханні.

Іншых падрабязнасцяў у бацькі не было, а цікавіцца імі ў Казловых (маіх аднакласнікаў — Колі, яго сястры Паліны і іх брата Федзі, які на два класы ішоў наперадзе нас і з якім я гуляў у адной футбольнай камандзе) было неяк няёмка, нетактоўна.

Хутчэй за ўсё, гэта незвычайная гісторыя так бы і засталася ў маёй памяці як адметны штрых чалавечых узаемаадносін і не лягла б на паперу, калі б летась, праз 58(!) гадоў пасля заканчэння школы, я не сустрэў былую аднакласніцу Паліну, з якой разам атрымлівалі атэстат сталасці. Яна працавала вольнанаёмнай пры Групе савецкіх войскаў у Германіі, потым жыла ў расійскім Чарняхоўску, а цяпер вось з сынам у Чачэрску (муж памёр). На той свет адышлі Ціт Міхайлавіч і Ульяна Фамінічна, старэйшыя браты і сястра. А самы малодшы брат Іван на пенсіі ўжо, таксама у Чачэрску жыве. Пасля размоў з ім, Палінай і жонкай Міколы Вольгай Сямёнаўнай Казловай і пацягнулася нітачка тых падрабязнасцяў, якіх не ведаў мой бацька.


Іван Казлоў гартае сямейны альбом.

### ОЙ, БЯРОЗЫ ДЫ СОСНЫ...

«Правільна вырашыў, Ціт Міхайлавіч, — сказалі Казлову ў раённым камітэце партыі, калі былы старшыня калгаса «XVI партз'езд» выказаў жаданне адправіцца ў адзін з партызанскіх атрадаў, якія толькі-толькі пачалі фарміравацца на Чачэршчыне. — Там вельмі спатрэбяцца твой вопыт удзелу ў грамадзянскай вайне і арганізатарскія здольнасці»

— Аню я вазьму з сабой, за яе будзем спакойныя. Дарослая дзяўчына ўжо: і бялізну зможа памыць байцам атрада, і пакухарыць, і ў разведку схадзіць, і іншыя даручэнні выконваць. Пад маім наглядам будзе. За старэйшага Міколу хвалявацца няма чаго таксама, у войску ён, немцаў біць будзе. А вось з табой і меншымі дзецьмі як быць?

— Не хвалюйся, — адказала Ціту Міхайлавічу яго жонка Юля Раманаўна. — У вёсцы застанемся, у Сярэдніх Малынічах. Мы ж — мірныя людзі, якая ад нас можа быць шкода немцам? Ніякай. Ідзіце сабе з Богам у лес. Ды нас не забывайце толькі.

На жаль, памылялася Юля Раманаўна. Гітлераўцы адразу ж пачалі ўстанаўліваць так званы новы парадак. Рабавалі насельніцтва, прымушалі працаваць да сёмага поту, каталі і расстрэльвалі тых, хто не выконваў распараджэнняў і загадаў. Колькасць такіх ахвяр ужо ў самым пачатку акупацыі дасягнула ў раёне некалькіх сотняў. Даведаўшыся аб усіх гэтых зверствах, Ціт Міхайлавіч вельмі ўстрывожыўся за сям'ю, што засталася ў Сярэдніх Малынічах: як яна там, ці не пагражае ёй небяспека? Прыхвасні гітлераўцаў, паліцаі, тым часам данеслі ім, што былы старшыня калгаса і яго 17-гадовая дачка ўзялі ў рукі зброю. Немцы схапілі Юлю Раманаўну, жорстка дапытвалі, дзе знаходзіцца партызанскі атрад, абяцалі, калі яе муж вернецца ў сям'ю і будзе служыць новай уладзе, Казловых ніхто чапаць не будзе.

Нічога не дабіўшыся ад жонкі партызана, карнікі расстралялі яе.

### «НЕ ПУШЧУ!»

Факт, што на чарзе былі 14- і 6-гадовы сыны Ціта Міхайлавіча Пеця і Федзя. Загубіць іх нацысты, вырашылі вяскоўцы. І падказалі Пецю, што заставацца ў Сярэдніх Малынічах ці хавацца ў бліжэйшых населеных пунктах ім нельга: знойдуць. Той, нядоўга думаючы, пасадзіў Федзю ў саначкі і павёз праз лугавіны ў лес шукаць бацьку з Аняй. Падціскаў мароз, дзьмуў сівер... Праз нейкі час яны апынуліся ў пасёлку Слабодка, пазіраючы на хаты: пагрэцца б, адпачыць.

Разгубленых хлапчукоў заўважыла маладая прыгожая жанчына Ульяна Якутовіч. Угледзеўшыся ў іх стомленыя і сумныя вочы, зразумела: нейкая бяда ў дзяцей, патрэбна дапамога. Жанчына запрасіла хлопчыкаў у хату, пакарміла, распытала, хто яны, дзе іх бацька і маці, адкуль і куды ідуць. Даведаўшыся аб усім, Ульяна Фамінічна расчулілася, крыху падумала, а потым рашуча сказала: «Нікуды вам не трэба ісці. Будзеце жыць са мной, Палінкай і Колькам (ім было на той час два і чатыры гады адпаведна. — **Аўт.**). І добра запомніце: хто б ні спытаў, чые вы, адказвайце, што мае сыны, я — ваша мама, а Палінка і Колька — вашы сястрычка і брацік».

***(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)***

■ У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

***Ужо больш як тры гады на тэлеканале АНТ выходзіць рубрыка «У вас будзе дзіця» (у рамках праграмы «Пакуль усе дома», а з нядаўняга часу — і ў пятнічных выпусках праграмы «Наша раніца»). Стваральнікі беларуска-расійскага праекта дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, адшукаць новыя сем'і. За гэты час 57 дзяцей ужо змянілі сцэны дзіцячых дамоў на цяпло і ўтульнасць сямейнага ачага. «Звязда», якая летась далучылася да праекта, таксама працягвае знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з маленькімі героямі рубрыкі, якім трэба так многа і так мала — бацькоўскі клопат, пяшчота і любоў.***

## Мішава мара

**Чатырохгадовы Міша з Віцебскага дзіцячага дома хоць і малы яшчэ, але мужчына з сапраўдным байцоўскім характарам. Пастаўлены некалі медыкамі дыягназ «дзіцячы цэрэбральны параліч» стаў для яго не прысудам, а стымулам працаваць над сабой. Дзякуючы неверагодным сіле волі Міша стаў на ногі (у літаральным сэнсе) і навучыўся самастойна хадзіць.**

«У Мішы дыягназавалі ДЦП другой-трэцяй ступені. Спачатку хлопчык не валодаў сваім целам, але праз пэўны час дзякуючы сваёй упартасці, аптымізму і празе жыцця ён пастараўся справіцца з існуючай праблемай», — з гонарам за падапечнага адзначае інструктар па масажы Алена Раманава. Яе словы рэхам паўтараюць і выхавальнікі, адзначаючы такія ўласцівасці характару Мішы, як дапытлівасць, актыўнасць, неканфліктнасць і шчырую цікавасць да самых розных заняткаў — ад чытання вершаў і спеваў да фізкультуры і гульняў з канструктарам. Міша, як заўважылі дарослыя, вельмі любіць жыццё і радуецца кожнаму яго імгненню — ці не рэдкая ў наш час якасць, якой варта было б навучыцца многім іншым? Зрэшты, хочацца верыць, што ў будучых Мішавых мамы і таты гэтыя жыццялюбства, дабрыня і вера ў будучыню ўжо ёсць і не хапае для поўнага шчасця толькі яго — гэтага маленькага, але такога мужнага хлопчыка...



Калі вы хочаце даведацца пра Мішу больш, патэлефануйце па нумары: (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.

■ Па сутнасці

# РАСКЛАД НА КАНІКУЛЫ

**Больш за 60 тысяч юных мінчан адпачнуць на летніх канікулах у дзіцячых аздараўленчых лагерах, паведаміў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Валерый НАФРАНОВІЧ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У летніках з кругласутачным знаходжаннем адпачнуць 35,2 тысячы дзяцей (з іх у 9-дзённых палатачных лагерах — 6,4 тысячы), у летніках з дзённым знаходжаннем пабываюць 26,3 тысячы дзяцей. Яшчэ каля 5 тысяч мінскіх падлеткаў правядуць вакацыі ў профільных лагерах (спартыўных, турыстычных, ваенна-патрыятычных і іншых). Акрамя таго, гэтым летам на базах устаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі адкрыюцца каля 50 лагераў працы і адпачынку, у якіх пройдуць аздараўленне і будуць працаваць больш за 1,5 тыс. падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. З мэтай прафілактыкі правапарушэнняў у ваенна-патрыятычных лагерах на базах воінскіх часцей, пагранічных застаў, навучальных устаноў МУС і МНС арганізуюць аздараўленне дзяцей, якія ўступілі ў канфлікт з законам і выхоўваюцца ў нядобранадзейных сем'ях.

Гэтым летам юных мінчан гатовы прыняць 35 дзіцячых загарадных аздараўленчых лагераў з кругласутачным знаходжаннем, больш за 350 лагераў з дзённым знаходжаннем, каля 200 палатачных і профільных лагераў.

# НЕМАЎЛЯТ ПРЫБЫЛО!

**За мінулы год у нашай краіне з'явіліся на свет 1277 двайнят і 18 трайнят. Прытым больш за палову нараджэнняў, як адзначае намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена КУХАРЭВІЧ, — гэта з'яўленне ў сям'і другога, трэцяга і наступных дзяцей.**

Доля другіх нараджэнняў узрасла з 36 працэнтаў у 2010 годзе да 40 працэнтаў у 2014-м, трэціх — з 8,6 працэнта да 11 працэнтаў адпаведна, чацвёртых і больш — з 3 працэнтаў да 3,7 працэнта. Доля першынцаў пры гэтым знізілася з 52 працэнтаў да 46 працэнтаў. Сярод рэгіёнаў рэспублікі па нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей лідзіруе Брэсцкая вобласць, а другія дзеці больш нараджаюцца ў Мінску.

Наогул, пачынаючы з 2011 года колькасць нованароджаных у рэспубліцы расце. Так, калі ў 2010 годзе нарадзілася 108 тысяч дзяцей, то ў 2014-м — 118,5 тысячы немаўлят (61,3 тысячы хлопчыкаў і 57,2 тысячы дзяўчатак). Гэта на 537 дзяцей больш, чым у 2013-м, і на 10,5 тысячы больш, чым у 2010-м.

Паводле слоў прадстаўніка Белстата, летась каэфіцыент нараджальнасці не змяніўся ў параўнанні з 2013-м і склаў 12,5 народжанага на 1000 чалавек насельніцтва. Гэта самы высокі паказчык за апошнія 10 гадоў.

# БЯСПЕКА Ў ДОМЕ — СПРАВА ТЭХНІКІ

**У дамах шматдзетных сем'яў могуць з'явіцца пажарныя апавяшчальнікі, якія будуць дасылаць SMS-паведамленні на тэлефоны бацькоў. Такую прапанову выказалі прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

«Мы прапануем у якасці эксперымента за кошт сродкаў праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Прафілактыка дзіцячага траўматызму» ўкараніць у дамах шматдзетных сем'яў перадачу GSM-сігнала на тэлефон бацькоў аб спрацоўванні аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка», — патлумачыў **галоўны спецыяліст упраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Міхаіл БАТУРА.** Паводле яго слоў, для гэтага ў кожным рэгіёне будуць выбраны найбольш схільныя да рызыкі дзіцячага траўматызму сем'і, дзе выхоўваюцца 6 і больш дзяцей. Як плануецца, да гэтай працы далучацца тэрытарыяльныя органы і падраздзяленні МНС, а таксама структуры Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Напрыклад, у эксперыментальным парадку падобная сістэма ўжо была ўсталяваная ў адным з прыватных дамоў у Слонімскім раёне Гродзенскай вобласці, дзе пражываюць 7 дзяцей. Там з-за дзіцячых свавольстваў мог адбыцца няшчасны выпадак, аднак GSM-сігналізацыя прадухіліла непрыемнасці, своечасова апавясціўшы бацькоў аб узгаранні. У якасці прыкладаў, калі падобная сістэма таксама магла б прадухіліць трагедыі, спецыяліст прывёў нядаўнія выпадкі ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці (там падчас пажару ў замкнёным доме загінулі трое дзяцей) і ў Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці (тады агонь забраў жыцці 2-гадовага дзіцяці, яго дзядулі і прадзядулі — інваліда 1-й групы).

Сістэма дзейнічае наступным чынам: пры выяўленні дыму апавяшчальнік выдае гукавы сігнал, які дублюецца ўсімі аб'яднанымі ў сетку апавяшчальнікамі, усталяванымі як унутры памяшкання, так і звонку пабудовы. Калі задымленне захоўваецца, прылада перадачы сігналу па GSM-сувязі перадае адпаведнае тэкставае паведамленне на тэлефоны сотавай сувязі і/ці праз канал GPRS — на web-сервер.

Паводле БЕЛТА

■ Сваімі рукамі

# МАМА МЫЛА... ВАРЫЦЬ!

## Гісторыя пра тое, як дэкрэтны водпуск можна спалучаць з ажыццяўленнем творчых мар

**Мінчанка Настасся ГАЛКОЎСКАЯ па адукацыі юрыст, працавала ў банку, але падчас дэкрэтнага водпуску «перакваліфікавалася» ў сапраўднага мылавара, да якога па парады звяртаюцца дзясяткі дзяўчат. Карэспандэнты «Звязды» на свае вочы ўбачылі, як функцыянуе хатняя мылаварня.**



Варыць мыла і ствараць з яго разнастайныя фігуры Насця пачала 5 гадоў таму, калі яшчэ вучылася на трэцім курсе юрфака БДУ.

— У пэўны момант мне захацелася знайсці сабе творчае прымяненне, — кажа Насця, якая сустракае нас на парозе сваёй кватэры з маленькім сынам Ягорам. — Разглядала розныя варыянты, пакуль не натрапіла ў інтэрнэце на артыкул аб тым, што дома таксама можна варыць мыла. Я літаральна загарэлася гэтай ідэяй! Хутка набыла ўсе інгрэдыенты і неўзабаве ўжо ўдзельнічала ў выстаўцы-кірмашы «Млын».

Насця з усмешкай кажа, што на той час яна была ў сталіцы адной з «піянерак» мыльнай справы.

— Людзі прыходзілі на кірмаш, глядзелі на мае вырабы вялікімі вачыма і не верылі, што ўсё гэта зроблена з мыла. Падобнае ў той час было ў навіну, а цяпер добрую частку вырабаў, што выстаўляюць майстры на «Млыне», складаюць мыльныя. Мылаварэнне — гэта сёння даволі распаўсюджаны занятак.

Гаспадыня паказвае свой «мыльны заводзік», які размяшчаецца... на кухні. Спецыяльнага абсталявання, якое мы «намалявалі» ў сваіх думках, тут няма. Галоўным прыборам з'яўляецца мікрахвалёўка, у якой многія мылавары растопліваюць мыльную аснову.

**— Дарэчы, якія інгрыдыенты патрэбны для таго, каб зварыць дэкаратыўнае мыла?**

— Па-першае, мыльная аснова, — пачынае пералік суразмоўца і дастае зарыхтаваны брусок, які нагадвае кавалак лёду. — Гэта ўжо прыгатаванае мыла. Толькі натуральнае, без хімічных дабавак. Раней я набывала англійскую аснову, а праз пэўны час перайшла на беларускую. Лічу яе больш якаснай.

**Што неабходна для хатняга мылаварэння?**

Мыльная аснова (выкарыстоўваецца яшчэ дзіцячае мыла), алей для мылаварэння (аліўкавы, міндальны, эфірны), фарбавальнікі (напрыклад, харчовыя, якія прадаюцца ў любой краме), посуд для растаплівання мыльнай асновы, сіліконавыя формы.

Тым часам сын нашага мылавара выцягвае з-пад стала пакет з лістамі разнастайных сіліконавых формаў для выпечкі. Фігуркі вельмі розныя: ад Мікі Маўса да пірожных і велікодных яек.

— Менавіта такія формы, запоўненыя нарэзанай асновай, ставяць на 20-30 секундаў у ЗВЧ-печку, каб растапіць напаўняльнік. Потым дастаюць, у форму дабаўляюць араматызатары, фарбавальнікі. А калі ўсё змесціва застывае (праз 10-20 хвілін), мыла для большай прыгажосці можна пасыпаць слюдой альбо бліскаўкамі.



Фота Надзеі БУЖАН.

**— А дзіця не перашкаджае ў такой далікатнай працы?**

— Ягорка ў нас з мужам непатрабавальны. У іншым выпадку з сынам застаецца муж, а я зачыняюся на кухні і працую.

**— Цікава, а якія фігуркі з мыла ў цябе найчасцей замаўляюць?**

— Некаторы час я была індывідуальнай прадпрымальніцай, і мяне прасілі падрыхтаваць святочныя наборы: мыла з сэрцайкамі, любоўнымі матывамі, упрыгожанае рознымі надпісамі. Адзін гандлёвы пункт папрасіў зрабіць падарункавае мыла для сваіх кліентаў.

Дарэчы, у мылавараў таксама ёсць паняцце «не сезон». Большасць заказаў майстры атрымліваюць напярэдадні свят: Новага года, Дня святога Валянціна, 8 Сакавіка... У астатні час мыла замаўляюць нячаста.

**— Напэўна, шмат прыходзіцца выдаткоўваць сродкаў на закупку мыльнай асновы і ўсіх гэтых араматызатараў...**

— 100 кілаграмаў мыльнай асновы, напрыклад, абыдуцца ў 6 мільёнаў рублёў. Але пры добрай працы грошы можна хутка вярнуць і атрымаць прыбытак.

**— Насця, а ці можаш уявіць, што і ў 40 гадоў ты таксама будзеш варыць мыла?**

— Наўрад ці. Хіба толькі ў тым выпадку, калі буду трымаць сваю крамку, кіраваць вытворчасцю, зарабляць гэтым добрыя грошы. Хочацца ўдасканальвацца. Нягледзячы на гэта, я маю шмат ідэй, якія хацелася б ажыццявіць. Напрыклад, усе бачылі магнікі з вывамі вядомых мясцін сталіцы. А чаму б не намаляваць на кавалачку мыла той жа Чырвоны касцёл? Мне здаецца, было б вельмі прыгожа.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Ёсць ідэя

# СВІНКА ПЭПА ЗАГАВОРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**Праўда, адбудзецца гэта толькі ў тым выпадку, калі прафесійнай суполцы агучвання кінапрадукцыі на беларускую мову «Кінаконг» удасца сабраць неабходныя сродкі — прыкладна 750 тысяч на адну серыю, або 37,5 млн на першы сезон (50 серый) папулярнага мультыплікацыйнага серыяла для малечы «Свінка Пэпа».**

Як адзначаюць прадстаўнікі суполкі, пераагучванне фільмаў яны займаюцца ўжо даўно, але для дзіцячай аўдыторыі будуць працаваць упершыню, каб хоць крыху выправіць «катастрафічны недахоп мультфільмаў для малечы на беларускай», на які часта скардзяцца маладыя бацькі.




Сродкі збіраюцца ў форме краўдфандынгу — гэта значыць, кожны, хто зацікавіцца праектам, можа выдаткаваць у яго падтрымку любую суму, якую палічыць патрэбнай. Важная ўмова: збор грошай неабходна правесці ў дакладна вызначаны тэрмін. «Кінаконг» мае для гэтага яшчэ крыху больш чым 40 дзён, прытым палова сумы ўжо сабраная.

Згоду на ўдзел у агучванні далі актрыса тэатра імя Я.Купалы, лідар музычнага гурта «Sunduk» і маладая маці Ганна Хітрык, а таксама акцёр тэатра імя М.Горкага і малады бацька Уладзімір Глотаў. Першыя дзве серыі мультсерыяла «Свінка Пэпа» на беларускай мове, агучаныя яшчэ год таму, дарэчы, можна ўбачыць і ацаніць у інтэрнэце — на канале YouTube. Плануецца, што і астатнія серыі будуць выкладвацца ў свабодным доступе тройчы на тыдзень, каб кожны ахвотны мог далучыцца да прагляду мульцікаў на роднай мове.

Вікторыя ЗАХАРАВА

■ Бацькоўскі нататнік

# ШТО РАБІЦЬ З ДЗІЦЯЧЫМІ СТРАХАМІ?

**Страх, трывога, неспакой у дзяцей могуць быць звязаны не толькі з рэальнай, але нават з уяўнай сітуацыяй. Дзеці могуць убачыць страшнае ў самым «нястрашным», напалохацца чаго заўгодна.**

— Па вялікім рахунку, для здаровага дзіцяці страх — натуральная рэакцыя ў працэсе вывучэння навакольнага свету, — тлумачыць **псіхолаг Цэнтра дружалюбнага стаўлення да падлеткаў «Поспех» Кацярына БЛІЗНЮК**. — У дашкольным узросце страхі ўзнікаюць часцей, а наогул у такога пачуцця ёсць пэўныя ўзроставыя асаблівасці. Так, нованароджаныя палохаюцца рэзкіх гукаў, набліжэння вялікіх прадметаў...

**У 7 месяцаў** дзіця праяўляе моцны неспакой пры доўгай адсутнасці маці. Падобны страх максімальна выяўляецца ў дзяўчатак да 2,5 года і ў хлопчыкаў да 3-х гадоў.

**У 8 месяцаў** з'яўляецца страх перад незнаёмымі людзьмі, асабліва жанчынамі, не падобнымі на маму. Звычайна гэты страх праходзіць да сярэдзіны 2-га года (пры адсутнасці такіх несрпыяльных момантаў, як размяшчэнне ў бальніцу, падзенне, балючыя працэдуры і інш.).

**У 2 гады** назіраецца боязь нечаканага з'яўлення незнаёмага рэзкага гуку, болю, вышыні, адзіноты, жывёл, транспарту, які рухаецца, і асабліва — цемры.

**У 3 гады** з'яўляецца страх перад пакараннем. Страх у дзяцей гэтага ўзросту выяўлены значна менш, калі бацька прымае ўдзел у выхаванні, калі не прыгнятаецца пачуццё «Я» (малое павінна мець магчымасць праяўляць свае эмоцыі, перажыванні).

**У 3-5 гадоў** многія дзеці баяцца казачных персанажаў (Бабу Ягу, усялякіх пачвараў), болю, нечаканых гукаў, вады, транспарту, адзіноты, цемры і замкнёнай прасторы. Асабліва часта апошнія страхі сустракаюцца ў дзяцей, чые бацькі неспакойныя і ў той жа час надта прынцыповыя.

**У 6 гадоў** часам з'яўляецца страх смерці (сваёй і бацькоўскай), што праяўляецца ў боязі нападу, пажараў, стыхій. Дашкольнікі востра рэагуюць на канфлікты ў сям'і, і гэта ўзмацняе страхі. Страхі часта праяўляюцца пры хірургічных аперацыях у саміх дзяцей або захворванні некага з дарослых у сям'і.

**У 7-8 гадоў** ранейшыя страхі, як правіла, адступаюць, але з'яўляюцца новыя: боязь спазніцца, атрымаць дрэнную адзнаку — быць непаспяховым.

**У падлеткавым узросце** страхі сустракаюцца радзей; тут, хутчэй, можа быць агульны стан трывожнасці, страх смерці бацькоў, страх вайны.

Пералічаныя страхі часовыя, і з імі не трэба неяк спецыяльна змагацца, проста трэба падтрымаць дзіця, прымаючы такую асаблівасць яго псіхічнага развіцця. Аднак бываюць і іншыя страхі. У іх аснове — псіхічная траўма, няўменне дарослага спраўляцца з узроставымі патрэбамі дзіцяці, жорсткасць і канфлікты ў сям'і, высокая трывожнасць у бацькоў. У такіх сітуацыях страхі самі не праходзяць, патрэбна дапамога спецыялістаў (псіхолага, псіхатэрапеўта), змена стылю выхавання.

Дапамагаюць пераадолець страхі гульнявыя метады: «маляванне» страхаў, гульня ў казачныя гісторыі з добрым канцом.



## ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ УЗНІКНЕННЯ І ЗАМАЦАВАННЯ СТРАХАЎ?

✓ Ніколі не зачыняйце дзіця ў цёмным незнаёмым памяшканні.

✓ Не палохайце (аддам чужой цётцы, прыйдзе Баба Яга, не падыходзь да сабакі, а то ўкусіць і г.д.).

✓ Ператварайце злых герояў у добрых (прыдумайце казкі пра тое, як Баба Яга стала добрай, як павучок дапамог дзяўчынцы выбрацца з лесу і г.д.).

✓ Не перагружайце фантазію дзіцяці: цацкі павінны адпавядаць узросту, таму выдаліце агрэсіўныя фільмы, мульцікі і кнігі (у 3 гады можна напалохаць і ваўком з «Чырвонага Каптурка», а 2-гадовага недарэчы набываць робата са зброяй або мяккага кракадзіла з разяўленай пашчай).

✓ Рыхтуйце дзіця загадзя да паступлення ў садок і школу.

✓ Павышайце самаацэнку малога.

✓ Разбярыцеся з уласнымі страхамі. Вы можаце «заразіць» дзіця сваёй бояззю сабак, смерці, самалёта і г.д.

✓ Улічвайце, што больш за ўсё схільныя да страхаў эмацыянальна-адчувальныя і ўражлівыя натуры, а таксама дзеці, у якіх добра развітае ўяўленне.

## ДАПАМАЖЫЦЕ МАЛОМУ

Высвятліце прычыну страху.

Усе дзеці любяць фантазіраваць, а таму скарыстайцеся гэтым: няхай дзіця малюе свае страхі, выдумляе казкі, у якіх яно моцнае ды смелае.

Калі малое баіцца цемры, замкнёнай прасторы, дык пакіньце ў яго пакоі святло, адчыніце дзверы, пакладзіце побач з ім любімую цацку. Можа спатрэбіцца цацачная зброя, якую можна пакласці побач з ложкам — каб можна было «абараняцца».

Вучыце пераадольваць страх з дапамогай гульняў, малявання, прайгравання сітуацый (калі баіцца ўрача — гуляйце ў бальніцу, баіцца цемры — гуляйце ў разведчыкаў і г.д.).

Заахвочвайце самастойнасць: няхай дзіця адчувае, што многае ўмее і ведае.



Пазбаўленне страхаў патрабуе цярпення і бацькоўскай падтрымкі. За страхі нельга сварыцца, караць, прысаромліваць.

Памятайце, што дзіця яшчэ не можа кіраваць сваімі паводзінамі, таму перакананне на словах малаэфектыўнае.

Выцiснуць страх з дзіцячай душы — складаная задача, але ж пакідаць яго там нельга, таму што ў будучыні гэта можа прывесці да праблем (неўрозаў, павышанай трывожнасці, раздражнёнасці, замкнёнасці і г.д.).

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

# БУДЗЬ ГАТОВЫ!

## Узрост ад 3 да 6 гадоў можна лічыць часам падрыхтоўкі да паступлення ў школу

**Адным з удзельнікаў гэтага працэсу з'яўляюцца дзіцячыя дашкольныя ўстановы, якія спрыяюць сацыялізацыі, пашырэнню кругагляду, развіццю інтэлекту, выхаванню навыкаў паводзін у грамадстве. Акрамя таго, там замацоўваюцца асновы здаровага ладу жыцця: рэжым дня, фізічная актыўнасць, здаровае харчаванне.**

Не сакрэт, што асаблівасці вучэбнага працэсу (сядзенне за партай, зрокавая нагрузка, зніжэнне рухальнай актыўнасці, неабходнасць запамінання вучэбнага матэрыялу) спрыяюць парушэнням з боку апорна-рухальнай і зрокавай сістэм, хуткаму знясіленню нервовай сістэмы. Вось чаму другі ўдзельнік падрыхтоўчага працэсу — бацькі — павінны паклапаціцца аб своечасовым абследаванні.

— Дзіця неабходна паказаць педыятру, атарыналарынголагу, неўролагу, стаматолагу, хірургу, афтальмолагу, лагапеду, а пры неабходнасці — кардыёлагу, нефролагу, эндакрынолагу, каб усе выявіць адхіленні ў здароўі скарэкціраваць да школы, — кажа **загадчыца педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ**. — Яшчэ да 3 гадоў дзіця павінен агледзець той жа лагапед, і ў выпадку адхіленняў у маўленні застанецца яшчэ час многае выправіць. Да школы дзіця павінна атрымаць усе прышчэпкі (згодна з Нацыянальным календаром прышчэпак) — гэта паслужыць аховай ад многіх небяспечных інфекцый, распаўсюджванне якіх у калектыве значна вышэйшае. Звярніце ўвагу яшчэ на некалькі важных момантаў.

**Начны сон** у дашкалят не можа быць менш за 10 гадзін. Пажаданая і **вячэрняя прагулка** на свежым паветры перад сном. Абавязкова — **ранішняя зарадка**, якая падрыхтуе да "працоўнага" дня. Харчаванне — 5 разоў на дзень, паўнацэннае і разнастайнае, з бялкамі, вугляводамі і тлушчамі (1:4:1), мінераламі і вітамінамі, каларыйнасцю 2000-2100 ккал/д.

У рацыёне павінны быць мясныя, малочныя і рыбныя стравы, кашы, гародніна, садавіна. Дзіця павінна выпіваць 1-1,5 л вады (першыя стравы, малако, сокі сюды не ўваходзяць, паколькі з'яўляюцца ежай). Салодкае і мучное неабходна абмяжоўваць. Гамбургеры, чыпсы, газіраваныя салодкія напоі наогул павінны быць пад забаронай — такая ежа адмоўна ўплывае на дзіцячы страўнікава-кішачны тракт.

Штодня дзіця павінна гуляць на свежым паветры.

Да паступлення ў школу неабходна ўжо вызначыцца са спартыўнай секцыяй, якая не толькі забяспечвае малое фізічнымі нагрузкамі, але і выдатна дысцыплінуе.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Вазьму твой боль...




# КАЛІ ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА НЕ З НАМІ

**Прысніла, што мае старыя сябры з дзіцячага анкацэнтра жывыя. Не парадавала гэта нават у сне. Бо яны мусілі зноў памерці, а я — яшчэ раз перажыць страту. І вось там, у сне, я адчула забытае пачуццё болю. Страшнае і невымернае, якое даўно развучылася адчуваць. Чалавек жа да ўсяго прывыкае. Нават да смерці.**

Чуллівыя людзі, схільныя браць усё блізка да сэрца, увесь час пакутуюць ад свайго «дару». Ім баліць і сваё, і чужое. Ім баліць вострае слова, сарваная кветка, кінуты сабака, адзінокія людзі. І баліць моцней, чым многім іншым. Яны ўразлівыя да немагчымасці.

Ім здаецца, што дар вострa адчуваць мае прыкладное значэнне. Можна, скажам, падзяліць чый-небудзь боль, узяць яго на сябе. Чаму б не сябраваць з цяжка (тут мусіць быць слова «смяротна», але яны не любяць яго ужываць) хворымі дзецьмі. І ў іх атрымліваецца. Заводзіцца сяброўства, пазітыў зашкальвае, боль адыходзіць. Сонейка свеціць, і здаецца, што ўсё будзе добра. Цуды ж здараюцца!

Але канкрэтна ў гэту хвіліну цуд здараецца ў нейкім іншым месцы. А твой сябар паміраe. Увесь боль, на які здольна чуллівае чалавечае сэрца, імгненна скручвае твой немагчыма ўразлівы арганізм. І ты адчуваеш яго на фізічным узроўні. Ён выварочвае нутро. Ён такі вялізны, што не змяшчаецца ў табе і гатовы разарваць на кавалкі. Раптоўна ва ўсім свеце становіцца так мала паветра, што яго не хапае менавіта табе. Ты задыхаешся ў прамым і пераносным сэнсе. Ты думаеш, што лепш было б памерці табе замест таго, хто быў тваім сябрам і мусіў жыць. Але ў той жа час ты не перастаеш верыць у цуды.

І цуд здараецца. Аднойчы ты адчуваеш, што можаш жыць з болем. Падымаеш галаву, выпростваеш заламаныя рукі і крочыш наперад. Насустрач цудам. Ты верыш у іх так, быццам ніколі не апякаўся. І зноў прымяняеш свой дар, спрабуеш раздзяліць чужы боль. А цуд зноў наносіць удар са спіны — ён зноў здараецца ў іншым месцы.

На трэці раз ты апранаеш кальчугу, каваныя латы і жалезны шлем. І ідзеш у бой з чужым болем. Ты ўжо не верыш у цуды і нічога не чакаеш ад іх. Ты не радуешся, калі яны ўсё ж здараюцца. Але і не засмучаешся, калі цуды здраджваюць. Ты ў брані, ты непахісны, ты непераможны.

Тое самае ў адносінах. Калі табе аднойчы разбіваюць сэрца, ты склейваеш яго па кавалках, залізваеш раны і спадзяешся, што зарастуць. На другі раз верыш, што першы быў выключэннем. А на трэці ты проста кладзеш спаласаванае сэрца ў сейф і забываеш пін-код. Ты забараняеш сабе пачуцці, ставіш блок на іх. Табе пашчасціць, калі знойдзецца настойлівы хакер і сам падбярэ запаветныя лічбы да сейфа, каб вызваліць тваё сэрца. А можа, і не пашчасціць, бо цуды часта здараюцца не з намі.

Мы паступова прывучаем цела да холаду, гартуючы яго. Душа гартуецца так жа. Яна прывыкае да холаду і болю. Яна чарсцвее, ледзянее. А мы становімся больш трывалымі і цынічнымі.

Яшчэ ў Я. Коласа дзед Курыла казаў «хлопчыку з чуткаю душой», Сымону-музыку, што такія ўразлівыя людзі не жывуць шмат, бо «не любяць свет і людзі, каб іх тайнасці пазнаць, каб заглянуць у іх грудзі і зняць тайнасці пячаць...» Вось і даводзіцца выбіраць чуллівым: хутка згарэць праз свае пачуцці ці забіць у сабе сымона-музыку.

Восем гадоў таму я ўпершыню зарэгістравалася ў сацыяльнай сетцы. Гэта быў Livejournal — ЖЖ. Мяне тады неверагодна натхніў фотаздымак, апублікаваны амерыканскай сяброўкай. Я ніколі не бачыла гэтую жанчыну, мы пазнаёміліся праз ЖЖ. Яна сфатаграфавала пейзаж за сваім акном: пышныя сосны ў шапках снегу. У нас — дажджы, слота, вецер, а там — шапкі прамяністага снегу. І ўсё гэта можна бачыць у жывым эфіры — прама зараз з іншага кантынента незнаёмы чалавек паказвае сваё наваколле, а ты дзелішся сваім, і вы зайздросціце адно аднаму.

Мне смешна і няёмка цяпер апісваць колішнія ўражанні, бо інтэрнэт стаў неад'емнай часткай жыцця, колькасць маіх акаўнтаў у сацсетках ужо імкнецца да дзясятка. Імгненным фота з іншага кантынента даўно нікога не здзівіш, і тым больш не натхніш і не ўразіш. Гэта я пра што? Пра тое, што ўсё прытупляецца, замыльваецца, чалавек да ўсяго прызвычайваецца. Нават да болю. Нават да смерці.

Панцыр з брані адначасова прыкрывае і сэрца, і душу. Ніякія пачуцці, эмоцыі не дабяруцца да іх. Ты не льеш слёзы над меладрамамі, цябе не калоціць ад чужога гора, ты нават пра сваю бяду холадна канстатуеш: «Бывае». І толькі калі Facebook зранку прышле напамін пра дзень нараджэння сябра, якога ўжо няма, нешта ўскалыхнецца ў грудзях. Ты не паспееш апрануць панцыр: не варта правяраць сацсеткі, яшчэ лежачы ў ложку. А ў цуды ўсё ж трэба верыць. Яны здараюцца. Хоць часам і не з намі.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

■ 50+: Жыць цікава

# «МІСІС КЛЕПІКАВА, ВАМ ПАШАНЦАВАЛА...»


Надзея Клепікава ў маладосці...

**Сённяшні наш аповед — пра дзяўчынку з глухой пасляваеннай сібірскай вёскі і яе велізарную любоў да Індыі. І пра тое, як ажыццявілася нязбытная, на першы погляд, мара — трапіць у гэтую далёкую экзатычную краіну. І не проста трапіць, а пасябраваць з мясцовымі жыхарамі, выступіць на індыйскім радыё, убачыць, як здымаецца кіно ў студыі яе куміра Раджа Капура. Гэты аповед — пра тое, што трэба верыць і марыць, пра цуд, якому ёсць месца ў любым чалавечым лёсе.**

## ВОСЬ ДЫК СУПЕРБАБУЛЯ!

Вясёлая, смяшлівая, абаяльная Надзея Іванаўна сустракае мяне на парозе і тут жа захоплена пачынае распавядаць пра конкурс капялюшыкаў у «Клубе бабуль» сталічнага Цэнтральнага раёна, у якім удзельнічала пару тыдняў таму. «Шэсць мужчын ацэньвалі нас, але вырашылі, што пераможа дружба. Бо ўсе так стараліся... І яны пабаяліся каго-небудзь пакрыўдзіць, — весела кажа яна і паказвае свой капялюшык. — Я папрасіла яго ў нявесткі. Тая зняла свой вясельны з антрэсоляў. А я ўпрыгожыла яго кветкамі і пайшла на конкурс. А потым — у фотаатэлье, што побач з домам, фатаграфавацца»...

У «Клубе бабуль» Надзея Клепікава не так даўно. А трапіла яна сюды, на першы погляд, зусім выпадкова: па дарозе з дачы ў Мінск у аўтобусе пазнаёмілася з жанчынай, якая і запрасіла яе: «Прыходзьце да нас на вул. Чырвоную, 3 — будзе весела!».

Так Надзея Іванаўна стала членам клуба, набыла верных сябровак і нават стала супербабуляй — выйграла гэтае званне ў гарадскім конкурсе два гады таму. Надзела сары, праспявала індыйскую песеньку, прыгатавала стол... І ўсім спадабалася!

Сапраўднае шаўковае сары, умение спяваць па-індыйску... Адкуль усё гэта ў звычайнай жыхаркі беларускай сталіцы?

## НАЗАЎЖДЫ ЎЛЮБІЛАСЯ Ў ІНДЫЮ

— Нарадзілася я за паўтара года да вайны, у глухой сібірскай вёсачцы, за 75 кіламетраў ад Барнаула. За 50 метраў ад дома — лес... З тых жа мясцін, дарэчы, спявачка Маша Распуціна, гумарыст Міхаіл Еўдакімаў, пісьменнік і рэжысёр Васіль Шукшын. Бацька неўзабаве памёр ад сухотаў, маці прыйшлося падымаць траіх дзяцей адной. Цяжка — не тое слова... — успамінае Надзея Іванаўна.

Надзі, як толькі яна крыху падрасла, прыйшлося кінуць школу і з'ехаць у горад працаваць нянькай. Аднойчы ў клубе дзяўчынка ўбачыла індыйскі фільм з Раджам Капурам — і назаўжды закахалася ў Індыю.

Надзі, напэўна, шанцавала на добрых людзей; а можа, яна сама прыцягвала іх сваім абаяннем і вясёлым характарам? Спачатку яна пазнаёмілася з жанчынай, якая аказалася загадчыцай дзіцячага садка і запрасіла яе працаваць нянечкай. Надзея пачала працаваць і жыць у дзіцячым садку, а яшчэ атрымала магчымасць пасля працы хадзіць у вячэрнюю школу.

А потым яе запрасілі ў магазін «Дзіцячы свет» адна з маці, у якой двое дзяцей хадзілі ў Надзіну групу. І яна пайшла. А там музычны аддзел, і ў ім пласцінкі, у тым ліку з песнямі яе любімага Раджа Капура... Так яна і жыла: працавала, хадзіла ў клуб на індыйскае кіно, а па вечарах разам з сяброўкай, як тысячы іншых дзяўчатак, бегала на танцы. Там і пазнаёмілася са сваім будучым мужам. Хоць сітуацыя была складанай — да таго моманту Надзея ўжо збіралася замуж за іншага, але... Ёсць такая прымаўка: мы плануем, а Бог толькі ўсміхаецца, гледзячы на нашы планы. Карацей, замуж наша гераіня выйшла за другога хлопца — Вову, сур'ёзнага, надзейнага, станоўчага. Той працаваў на будоўлі майстрам. Сам з Новачаркаска, што каля Растова-на-Доне, а ў Сібір прыехаў па размеркаванні пасля інстытута...

## ЗБІРАЙСЯ, ПАЕДЗЕМ ДА ТВАЙГО РАДЖА КАПУРА!

Туды, у Новачаркаск, маладыя і паехалі жыць пасля адпрацоўкі размеркавання. Муж пайшоў працаваць на Новачаркаскую ГРЭС, якая якраз будавалася, і прайшоў усе прыступкі: ад майстра да начальніка будоўлі. Потым кіраўніцтва стала пасылаць яго як добрага спецыяліста на іншыя электрастанцыі, і сям'я нямала паездзіла па Савецкім Саюзе. Двое дзяцей нарадзіліся ў розных, як цяпер мы гаворым, краінах: сын у Расіі, дачка — ва Украіне. Усюды яны пачыналі, можна сказаць, з нуля, з калкоў, што былі ўбітыя ў чыстым полі... Аднойчы наступіў дзень, калі мужу прапанавалі працу за мяжой. Спачатку ў планах у міністэрства было пасляць яго ў Іран, але ўрэшце карты склаліся так, што адправілі яго ў іншае месца.

— Ён прыехаў дадому і кажа: здагадайся, куды нас пасылаюць? — успамінае Надзея Іванаўна. — А ў мяне нічога ў думках няма. Не ведаю, кажу. І тады ён мне: ну, збірайся, паедзем да твайго Раджа Капура.

## «ЯК ЯНА СПЯВАЕ НАШЫ ПЕСНІ»...

У сваёй казцы, у мары, якая раптоўна стала явай, Надзея пражыла пяць гадоў.


...і сёння

Муж працаваў, а яна, па няўрымслівасці свайго характару, не магла сядзець проста так, без справы. Стала арганізоўваць сустрэчы сем'яў савецкіх спецыялістаў з сем'ямі індыйскіх калег, якія разам будавалі электрастанцыю. Развучвалі розныя канцэртныя нумары і выступалі адзін перад адным. Надзея спявала індыйскія песні, яе выступленні мелі поспех. А яна паглядзіць фільм, запіша песню на магнітафон, вывучыць словы — і спявае. Ды яшчэ самыя сапраўдныя канцэртныя нумары ставіць! Жонкі калег-індусаў прысылалі да яе сваіх дзетак перапісаць словы.

**Муж проста палюбіў Мінск і яго жыхароў. Прыехаў і сказаў: паехалі туды жыць!**

Увогуле, калі з Масквы прыехаў карэспандэнт «Известий», каб напісаць пра савецкіх спецыялістаў, якія будуюць у далёкай Індыі электрастанцыю, то ў сваім артыкуле Надзеі ён прысвяціў нават больш радкоў, чым яе мужу — кіраўніку гэтых самых савецкіх спецыялістаў!

А аднойчы да Надзеі прыехалі з індыйскага радыё і запісалі перадачу — «аб місіс Клепікавай і аб тым, як яна спявае нашы песні».

...Калі Надзея Іванаўна з мужам праз пяць гадоў з'язджалі дадому, у Савецкі Саюз, індусы зрабілі ім прэзент — падарожжа па знакавых мясцінах: Калькуце, Варанасі, Бамбею і іншых гарадах. А самае галоўнае, ведаючы запал «місіс Клепікавай», арганізавалі паездку на студыю Раджа Капура! У планах было нават знаёмства з самім кумірам, але, на жаль, ён не змог прыняць «місіс Клепікаву» ў сябе дома — на той час ёнужо моцна хварэў.

Тым не менш Надзея Іванаўна з мужам сталі першымі іншаземцамі, якім арганізавалі экскурсію па яго студыі. Яны пабывалі ў касцюмерных «зорак» індыйскага кіно Раджа Капура, Аміта Бачана, Рэкхі, убачылі, як праходзяць здымкі кіно... «Пашанцавала вам, місіс Клепікава», — толькі і змог сказаць перакладчык.

## ДЗЕСЬЦІ АСЕСЦІ

Вярнуліся ў Савецкі Саюз — а тут «перабудова». Усюды разруха, паліцы ў крамах пустыя... Трэба было дзесьці асесці. У Індыі ў іх была перакладчыца Святлана з Мінска, якая з надзвычайнай цеплынёй распавядала пра свой родны горад... І вось вырашылі патэлефанаваць Святлане. А тая крычыць у трубку: «Едзьце да нас, у нас тут добра»! Муж сабраўся і паехаў «у разведку». Прыехаў на вакзал — і не ведае, куды далей. А трэба было трапіць на вуліцу Чычэрына, дзе размяшчалася Мінэнерга. Ён стаў пытацца ў людзей.

Потым расказваў: «Надзя, ты не паверыш! Мінчане сталі мне тлумачыць, потым прапаноўваць сваю дапамогу, а адна жанчына нават села са мной у тралейбус і прывезла куды трэба. Якія там людзі — золата! Заўсёды дапамогуць!».

Муж проста палюбіў Мінск і яго жыхароў. Прыехаў і сказаў: паехалі туды жыць!

Так яны апынуліся ў сталіцы Беларусі. Атрымалі спачатку пакой, потым і кватэру. Перавезлі дзяцей — дачку Наташу і сына Аляксея. Потым яшчэ два гады працавалі ў Іране, пасля якога вярнуліся ў Мінск ужо як дамоў, назаўсёды. «Мужа ўжо 8 гадоў як няма са мной, — кажа Надзея Іванаўна. — На жаль, у яго развіўся цяжкі дыябет, і ў 67 гадоў мой Вова памёр...»

Цяпер яе аддушына — дача. «Ніхто яе не любіць, акрамя мяне. Я на ёй кветачкі вырошчваю ў сваё задавальненне», — дзеліцца мая суразмоўца. Разам з сяброўкамі з «Клуба бабуль» яна часта ходзіць у тэатры і на выставы. «Усе оперы ўжо перагледзелі», — смяецца Надзея Іванаўна. Яна не маркоціцца: жыццё цудоўнае ў любым узросце.

Ну, і ў чым тут заслуга Надзеі Іванаўны? — спытае недаверлівы чытач. — Гэта ж усё яе муж!

**Святлана БУСЬКО.**
**Фота з архіва гераіні.**

■ Наш фармат

# БАБУЛЯ, ЯКАЯ ЖЫВЕ Ў СЕЦІВЕ

За 1,5 года больш як 2 тысячы пажылых беларусаў засвоілі інтэрнэт

**Сацыяльна-асветніцкі праект па навучанні пенсіянераў асновам камп'ютарнай граматнасці «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя» другі год запар прызнаецца найлепшай сацыяльнай ініцыятывай года. Такое рашэнне агучыла міжнароднае журы прэміі ў галіне карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, зладжанай фондам «Ідэя».**


Фота www.mts.by.

Нагадаем, асветніцкі праект, у якім валанцёры бясплатна вучаць пенсіянераў абыходзіцца з камп'ютарнымі прыладамі і арыентавацца ў інтэрнэт-рэсурсах, узяў пачатак яшчэ ў кастрычніку 2013 года. Курс камп'ютарнай тэорыі і практыкі, складзены з улікам псіхалагічных і ўзроставых адметнасцяў пажылых людзей, разлічаны на 3,5 месяца — па 1 занятку на тыдзень. З моманту запуску больш як 150 маладых людзей далучыліся да каманды добраахвотных выкладчыкаў і дапамаглі бабулям ды дзядулям пераадолець «лічбавы разрыў» паміж пакаленнямі і банальную боязь сучасных тэхналогій, а ў ролі «курсантаў» пабывалі ўжо больш як 2 тысячы пажылых беларусаў па ўсёй краіне. Цяпер усе яны могуць самастойна знаходзіць лекі ў аптэках свайго горада і заказваць талоны да ўрача, а таксама набываць білеты праз інтэрнэт, ажыццяўляць камунальныя плацяжы, даведвацца пра расклад аўтобусаў і цягнікоў, перапісвацца з сябрамі і роднымі ў сацыяльных сетках, весці ўласныя блогі і знаходзіць патрэбную інфармацыю ў інтэрнэт-пошукавіках.

Нядаўна, дарэчы, адбыўся чарговы — агульнарэспубліканскі — выпуск праекта «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя». Найбольш «падкаваныя» і эрудзіраваныя слухачы камп'ютарных курсаў для пажылых, прайшоўшы папярэдні адбор у сваіх рэгіёнах, прыбылі ў Мінск на інтэлектуальны турнір «Бітва аднагрупнікаў».

Усяго 20 выпускнікоў з тысячы курсантаў дайшлі да фінальнага спаборніцтва, у межах якога трэба было правільна адказаць на 10 не самых простых пытанняў пра інтэрнэт і камп'ютарныя тэхналогіі. Прычым скідкі на ўзрост і памяць удзельнікам турніру ніхто не рабіў.

...Напрыклад, ці многія з маладых «уладароў гаджэтаў» і заўсёднікаў сацыяльных сетак ведаюць, калі быў адпраўлены першы электронны ліст, і дакладна адкажуць, хто такі блогер? А вось выдатнікі курсаў для пажылых, да радасці і здзіўлення шматлікіх гасцей і балельшчыкаў, шчоўкалі гэтыя і іншыя пытанні, як арэшкі! У выніку сталічная каманда «Дружба» з мінімальнай перавагай усяго ў адзін бал абышла зборную рэгіёнаў «Павуцінне». Прынамсі, незалежна ад паказаных вынікаў, прайграўшых і пакрыўджаных сярод удзельнікаў спаборніцтва не аказалася. «Я вучуся, развіваюся, чытаю свежыя навіны, кантактую са сваякамі па Skype і нарэшце пачаў разумець свайго ўнука, які і прапанаваў мне пайсці на курсы. Гэты праект паказаў сотням пажылых людзей, што мы можам крочыць у нагу з часам», — не ўтойваў станоўчых эмоцый адзін са сталічных выпускнікоў-пенсіянераў Яўген Маргунскі.

Ужо напрыканцы сакавіка пачаўся чарговы этап асветніцкай праграмы, і за камп'ютары ў вучэбных класах селі яшчэ каля 1200 чалавек. «Аналізуючы заяўкі, якія паступаюць ад пенсіянераў, мы звярнулі ўвагу, што прыкладна на 40% вырасла колькасць зваротаў ад людзей, старэйшых за 50 гадоў. Амаль кожная другая заяўка прыходзіць ад людзей, якія ніколі ў жыцці не выходзілі ў інтэрнэт і не маюць нават базавых навыкаў, — адзначае кіраўнік камерцыйнага дэпартамента МТС Яўген Бранцаў. — Гэты досыць высокі працэнт сведчыць, што ў грамадстве існуе пэўная праблема: старэйшаму пакаленню стала некамфортна жыць у сучасным высокатэхналагічным свеце. Але яны моцна матываваныя і гатовыя вучыцца, пераадольваць псіхалагічны бар'ер на шляху да новых ведаў і ўменняў. Нам застаецца толькі дапамагчы ў гэтым».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

**Зрабіць свой унёсак у «камп'ютарную асвету» можа кожны ахвотны — далучыцца да каманды выкладчыкаў можна праз старонку праекта www.vozrast.mts.by. Тут жа, дарэчы, змешчаны і бясплатны вучэбны дапаможнік, з дапамогай якога можна стаць выкладчыкам інтэрнэт- і камп'ютарнай асветы для сваіх блізкіх.**

■ **Прэм'ера рубрыкі:** На гатовенькае!

**Кім ні былі б мы па статусе, на якой пасадзе ні працавалі б, якіх вышыняў і поспехаў ні дасягнулі б у кар'еры, сапраўдныя мы дома. Тут, побач з самымі блізкімі людзьмі, нам найбольш утульна і спакойна. Тым больш калі ў доме таксама ўтульна і спакойна і смачна пахне пірагамі. Ці наварыстым баршчом. Ці смажанымі дранікамі...**

# КУЛЕШ АД АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**У кожнага з нас ёсць свая адметная страва (а то і не адна), якой мы любім радаваць сябе і сямейнікаў і частаваць гасцей, ёсць свае прыхільнасці да тых ці іншых прадуктаў харчавання, свае «фірменныя» рэцэпты... Чаму б не распытаць пра гэта ў вядомых беларусаў і не папрасіць іх падзяліцца кулінарнымі сакрэтамі?.. Першы, да каго мы напрасіліся ў госці, — лаўрэт Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, вядомы драматург, стваральнік сцэнарыя легендарнага фільма «Белыя Росы», старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Аляксей ДУДАРАЎ.**

Праўду кажучы, на ўтульнай кухні Дударавых гаспадарыць жонка драматурга, Валянціна Віктараўна. Аляксей Ануфрыевіч адразу прызнаўся мне, што зрабіць нейкую страву, каб пацешыць сябе і сяброў, ён можа — пэўна, як і кожны мужчына. А вось гатаваць ежу кожны дзень...

*— Не. Калі трэба жонцы дапамагчы — я дапамагу, але толькі, калі трэба. Я сялянскі хлопец. А ў вёсцы спакон веку каля печы тупала жанчына. Не тое, што мяне так выхоўвалі — я гэта бачыў і адчуваў, вось у чым справа, а не ў ганарыстасці...*

Наогул, як сцвярджае драматург, ён ніколі не ставіўся да харчавання неяк па-асабліваму, і цалкам згодны з прымаўкай: «Чалавек есць для таго, каб жыць, а не жыве для таго, каб есці». Зразумела, для гэтага ў Аляксея Ануфрыевіча ёсць свае прычыны.

**— Калі я ўпершыню пакаштаваў аліўкі і масліны, скрывіўся і падумаў: «Ну, цяпер буду хадзіць і казаць усім: о, я ж пакаштаваў іх!..»**

*— Я нарадзіўся праз пяць гадоў пасля вайны. І што такое нішчымніца, ведаю добра... Нішчымніца — гэта бульба, звараная ні з чым, таму што нічога не было тады... А затаўканая — гэта калі разам з бульбай ужо варыўся кавалак мяса ці кавалак сала. Я рана пачаў памятаць сябе, дзесьці гадоў з двух — не ўсё, зразумела, а так, эпізодамі. Але нішчымніцу памятаю. Бывае, і цяпер звару і з'ем. Мне здаецца, што ежа мала ўплывае на чалавека. Калі вустрыцамі харчавацца, дык што, эстэтам станеш ці Маркам Шагалам? Наўрад ці.*

Пра вустрыц Аляксей Ануфрыевіч узгадаў, мусіць, усё ж такі невыпадкова. Яшчэ зусім нядаўна ў наша жыццё ўвайшлі новыя экзатычныя стравы, заморская садавіна, гародніна, морапрадукты — тыя ж самыя вустрыцы, кальмары і іншае, — а сёння многія беларусы ўжо не ўяўляюць без іх свой стол, асабліва моладзь. І на святы гатуюць не клёцкі з «душамі», не галубцы з мясам і нават не салату «аліўе», як рабілі бацькі, а піцу ці сушы... Цікаўлюся, што з кулінарных наваўвядзенняў прыйшлося даспадобы Аляксею Ануфрыевічу?

*— Калі я ўпершыню пакаштаваў аліўкі і масліны, скрывіўся і падумаў: «Ну, цяпер буду хадзіць і казаць усім: о, я ж пакаштаваў іх!..» Але потым, як рассмакаваў!.. Па маладосці, калі мне было гадоў 30, я заказваў іх вялікімі порцыямі і з'ядаў... Можа, чаго ў арганізме не хапала? Што тычыцца піцы ці сушы, дык хлеб з салам і часнаком смачнейшы! Нейкія экзатычныя стравы — гэта даніна модзе, а я за модай ніколі не ганяўся. Між іншым, лічу, што яна праходзіць, як і поры года. Сёння адно модна, заўтра — другое, паслязаўтра — трэцяе... Трэба есці — і не саромецца — тое, да чаго ў цябе ляжыць душа.*

Апроч таго, Аляксей Ануфрыевіч падкрэслівае, што з узростам трэба ўсё ж такі сябе абмяжоўваць — есці менш мучнога, мяса таксама спажываць меней... І тут жа з усмешкай прызнаецца:

*— Але шашлыкі я люблю, смажаную рыбу на мангале — вельмі люблю! І гатаваць, і есці. Хоць ведаю, што гэта шкодна. А тое, што шкоднае, заўсёды смачнае. А тое, што карыснае, заўсёды, як лекі...*

Вядома, жыццё такога вядомага і публічнага чалавека, як Аляксей Дудараў, звязана с паездкамі, камандзіроўкамі, удзелам у розных міжнародных мерапрыемствах, дэкадах дружбы, фестывалях. Зразумела, што драматургу даводзілася часта знаёміцца і з новымі людзьмі, і з новай культурай, і з новай кухняй. І ўсё роўна Аляксей Ануфрыевіч застаўся прыхільнікам беларускай кухні. Чаму мала што з замежных страў пераняў для сябе? Дудараў тлумачыць гэта з гумарам:

*— Усё, што звязана, напрыклад, з поўднем, — вострае, там багата перцу, чорнага, стручковага... І гэта мне падабаецца. Але зноў — гэта шкодна, калі ўжываць у вялікіх колькасцях. А калі ў малых, дык... «Чаго не п'еш?» — спытаўся я ў аднаго ў час бяседы. А ён мне: «А я мала не ўмею!..»*

*Дарэчы, у Кітаі мне давялося паесці... смажаных пчол! Стаяла нешта ў талерцы, я спытаў: «Што гэта?» Кажуць: «Пчолы!» Я паспытаў — нешта падобнае на папкорн... Я тады яшчэ раз паспытаў, потым яшчэ... Але нічога асаблівага. І каб цяпер я апынуўся там, за сталом, і мне прапанавалі б смажаных пчол, я іх есці не стаў бы. Не таму, што пчолак шкада, а проста нічога асаблівага. На чым ты ўзгадаваны, тое і павінен есці. У кожным разе, смажаных пчол я есці не хачу!*

Напэўна, у кожнага ёсць хаця б адна страва, з якой звязаны цёплы ўспамін з маленства: зацірка або бабка, мачанка або поліўка, або халаднік, або калдуны, або аладкі... Нават цяжка ўявіць, што — настолькі багатая на смачныя стравы беларуская кухня. Хутчэй за ўсё, гэтую страву гатаваў хтосьці з блізкіх людзей — маці ці бабуля, ці бацька — і яна стала ўлюбёнай на ўсё жыццё. Ёсць такая страва, любімая з дзяцінства, і ў Аляксея Ануфрыевіча.

*— Мая мачаха, светлая ёй памяць, вельмі смачна гатавала ў печцы. І што я пераняў ад яе і што стала маёй фірменнай стравай — гэта кулеш. Можа, гэта і не кулеш класічны, але яго так гатавалі ў нас.*

Безумоўна, я не магла не папрасіць драматурга падзяліцца рэцэптам сваёй любімай стравы.

*— Калі ласка. Спачатку адварваюцца некалькі бульбін разам з сялянскай, пальцам пханай каўбасой. Калі каўбасы няма, то нічога страшнага: можна замяніць яе на рабрынкі ці костку з мясам. Потым каўбаса дастаецца, а гэтая бульба пераціраецца калатоўкай (ці блендарам, як цяпер робяць) да такога стану, каб атрымаўся густаваты бульбяны булён. Потым бярэцца мука, разводзіцца ці вадой, ці малаком — што да смаку, і гэтую сумесь трэба дабавіць, перамешваючы, у булён. Потым туды зноў закідваецца каўбаса і яшчэ хвілін пяць кіпіць. Часнок кладзецца, яшчэ прыправы нейкія — на смак... Гэта і ёсць кулеш, яго раней гатавалі ў чыгунку, у печы. Гэта была ежа касцоў: калі добра памахаеш касой, тады трэба каларыйнага і смачнага з'есці. Ён быў вельмі смачны з печы — памятаю, скарыначка была такая зверху, тлушч расплаўлены плаваў... Як я чытаў, кулеш можна не толькі на муцэ рабіць, але і нейкія крупы класці. Аднак я люблю той, які гатавалі спачатку мама мая, потым мачаха.*

Вядома, каб страва атрымалася як след, трэба ведаць асаблівасці яе прыгатавання. Бо ў кулінарыі здараецца — заменіш адзін інгрэдыент на другі і не толькі іншы смак атрымаеш, але наогул можаш усё сапсаваць. Трэба не раз і не два страву прыгатаваць, каб яна ўрэшце ўдалася. Падобным вопытам можа падзяліцца і Аляксей Дудараў...

*— Была ў мяне вельмі пацешная гісторыя, звязаная з гэтым куляшом. Значыць, усё па рэцэпце раблю: узяў муку, развёў вадой... Наліваю — клейстар атрымліваецца! Што такое?! Потым разабраўся: пераблытаў муку з крухмалам! Выліў, зразумела. Наступным разам паленаваўся бульбу варыць, надзёр на тарцы, дабавіў. Зноў — клейстар! Аказалася, калі на тарцы дзерці, крухмал аддзяляецца і таксама клейстар атрымліваецца. А я думаю, што за пракляцце?!. Калі мачысе расказаў, яна пацвердзіла, што бульбу на кулеш трэба толькі варыць. Больш такіх памылак не дапускаў. І цяпер, калі нейкае свята ці сябры прыходзяць, я гатую кулеш, і ўсе яго хваляць.*

Згадка пра сяброў не магла не выклікаць пытання наконт гасцей. Ці часта наогул бываюць яны ў хаце Аляксея Дударава?

**У Кітаі мне давялося паесці... смажаных пчол! Стаяла нешта ў талерцы, я спытаў: «Што гэта?» Кажуць: «Пчолы!» Я паспытаў — нешта падобнае на папкорн...**

*— Апошнім часам — не. З узростам, значыць. Аляксандар Разенбаўм выдатна напісаў: «Уже не мчимся в гости на ночь глядя...» Гэта раней сябры маглі прыйсці да мяне і ў тры гадзіны, і ў пяць... Прыходзілася ўставаць, наразаць сала, нешта там на стол выстаўляць, нейкія размовы весці...*

Вядома, падчас посту Аляксей Ануфрыевіч кулеш не гатаваў: драматург хоць і не строга, але стараўся трымаць яго...

*— Стараўся не есці мяса, яек, масла. Аднак нічога нельга абсалютызаваць і пост таксама. Тым, хто зацята да гэтага ставіцца, я расказваю такі анекдот: два разбойнікі забілі падарожнага, адкрываюць яго сумку — там грошы. Падзялілі. Яшчэ — кавалак сала. Адзін разбойнік другому кажа: «Давай з'ядзім». А той у адказ: «Дык нельга ж — пост!»... Трымаць пост — гэта справа ўнутраная, і трымаць яго трэба заўсёды, усё жыццё. А нам здаецца, што калі я сёння мяса не з'еў, то мне ўсё даруецца. Чалавеку, які ў пост паводзіць сябе не так, як трэба, хочацца сказаць: «З'еш ты лепш мяса ці каўбасы!» Ці вось гэты анекдот яму трэба расказаць. Падкрэсліваю, анекдот — не антыхрысціянскі, ён — самы што ні ёсць хрысціянскі!*

Развітваючыся з Аляксеем Ануфрыевічам, я напаследак пацікавілася, якая страва ў яго самая-самая любімая.

*— Сала! Як Міколка-паравоз казаў: «Ці есць цар пражаны гарох? Бо смачней за пражаны гарох на свеце нічога няма!» Так і я магу сказаць: смачней за сала нічога няма!..*

**Падрыхтавала Тамара БУНТА**

## У КУЛІНАРНЫ БЛАКНОТ:

КУЛЕШ — гэта рэдкаватая страва, добра вядомая ў Беларусі. Звычайна кулеш гатаваўся так: у мясны булён, у якім варылася рабрынка, каўбаса, мяса, закалочвалася мука; калі не было мяса, кулеш засквarвалі салам. Ёсць прыказка: «У гасцях — каша, а дома — кулеш, дык лепш».

Вось рэцэпт куляшу з кнігі «Беларуская кухня» (Мн., «Ураджай», 1984). Каб зварыць яго, спатрэбіцца:

*2 шклянкі прасяной або гарохавай мукі, 60 г сала, соль.*

*У кіпень засыпаць невялікімі дозамі прасяную або гарохавую муку, дадаць соль, дробна парэзаныя кавалкі сала. Варыць на невялікім агні, перыядычна памешваючы, каб кулеш не падгарэў.*

У некаторых рэгіёнах кулеш атаясамляецца з крупнікам, крупеняй — стравай, якая гатуецца з круп (у асноўным прасяных і ячных) на мясным булёне ці засквarваецца салам.

Каб зварыць кулеш з круп, спатрэбіцца:

*2 л вады, 200 г свініны ці некалькі свіных рабрынак, 0,5 шклянкі прасяных круп, 1 цыбуліна, 50 г сала, соль, лаўровы ліст, прыправы — на смак.*



*Нарэзаць мяса кубікамі, пакрышыць цыбуліну і зварыць у каструлі булён. Крупы прамыць і засыпаць у булён. Сала дробна парэзаць і адбіць да атрымання аднастайнай масы, пакласці ў булён, пасаліць, дадаць лаўровы ліст, прыправы. Варыць кулеш да гатоўнасці круп.*

Смачна есці!

■ Маміна кухня

# «МЯСНУШКІ» ДЛЯ НЕХАЧУШКІ

*Ці бывалі ў вашых дзяцей такія перыяды, калі зубкі ўжо ўсе ёсць, а жадання імі працаваць — няма? У прыватнасці, гаворка ідзе пра мясныя стравы. З маёй старэйшай дачушкай ва ўзросце прыкладна 2,5 года мы доўга мучыліся, прапаноўвалі ёй то адно, то другое. А потым я раптам прыгадала пра рэцэпт яшчэ са свайго дзяцінства — маленькія сушкі, начыненыя фаршам, якія бабуля называла «мяснушкамі». І яны зрабілі сапраўдны цуд — дачка настолькі палюбіла гэтую страву, што пакрысе перастала «фыркаць» на мяса наогул... Спадзяюся, наш вопыт і рэцэпт будзе карысным і для іншых маці «нехачух».*

Для прыгатавання мяснушак спатрэбяцца зусім простыя прадукты: каля 200 г сушак (лепш браць «Малышок», каб дзіця магло з'есці сушку за раз), крыху малака, 100 г цвёрдага сыру, пару лыжак смятаны, алей, а для начынкі — 300 г курыцы (лепш філе) або нятлустай свініны напалам з ялавічынай, крыху пятрушкі ці кропу, соль, рэпчатая цыбуля, яшчэ па жаданні — памідор.

Сушкі пакладзіце ў міску і заліце гарачым малаком так, каб яны былі цалкам пакрыты вадкасцю. Іх трэба пакінуць набухаць на 15-20 хвілін — да такой ступені, каб цвёрдых навобмацак участкаў не засталося, але, з іншага боку, яны не павінны разваліцца.

Мяса прапусціце двойчы праз мясарубку або здрабніце ў блендары, цыбулю дробна нашаткуйце (у дадатак, калі вашы дамашнія не супраць, можна здрабніць зубок часнаку), пятрушку ці кроп вымыць, абсушыць і таксама дробна парэзаць. Усё перамяшаць у фарш, пасаліць.

Бляху змажце крыху алеем і выкладзіце на яе сушкі, а ўсярэдзіну кожнай добра ўтапчыце 2-3 чайныя лыжкі фаршу — так, каб была невялічкая горка. Зверху кожную мяснушку абмажце смятанай. Калі любіце памідоры — парэжце іх на нятоўстыя скрылікі і пакладзіце на фарш.

Запякаць мяснушкі трэба 15-20 хвілін у духоўцы, разагрэтай да 180 градусаў (калі трымаць больш, ёсць рызыка перасушыць іх, і яны зноў стануць цвердаватымі). Пасыпаць цёртым сырам раю літаральна за 5 хвілін да гатоўнасці, каб той паспеў расплавіцца, але застаўся мяккім.



Мяснушкі смачныя і ў гарачым выглядзе — як другая страва, і ў халодным — як бутэрбродзікі, напрыклад, да булёну.

**Таццяна РАДЧАНКА, г. Мінск**

# Яна сказала: «Я НЕ СУПРАЦЬ...»


Ціт Міхайлавіч і Ульяна Фамінічна з малодшымі дзецьмі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Між тым гітлераўцы спахапіліся шукаць сыноў партызана ў Сярэдніх Малынічах і Отары, у якім да вайны Ціт Міхайлавіч узначальваў калгас, шныпарылі па суседніх населеных пунктах, выклікалі на допыт вяскоўцаў, але адказ быў адзін: не ведаем. А жыхары пасёлка Слабодка, які знаходзіўся ў зарэчнай лясной зоне, трымалі дамоўленасць — у Ульяны Фамінічны Якутовіч чацвёра дзяцей, усе — родныя.

З цяжкім сэрцам, у вялікай трывозе жыў Ціт Міхайлавіч: загінула жонка, зніклі дзеці. Што з імі? Трывожыўся і атрад. Адпаведнае заданне атрымалі сувязныя, і праз некаторы час стала вядома: Пецю і Федзю прытуліла ўдава са Слабодкі Якутовіч, муж якой, каваль Сцяпан Казіміравіч, быў у 1938 годзе арыштаваны за праслухоўванне польскіх радыёперадач, сасланы ў Сібір, дзе і загінуў.

